

КАСКАДЗЁР ПАВІНЕН БЫЦЬ АКЦЁРАМ

ЧЫРВОНКА

ЗНАЙСЦІ Ў КОЖНАЙ РАЗЫНАЧКУ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 СТУДЗЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 17 (29639)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАНІК, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«У 2021 годзе ў выканаўчыя і распарадчыя органы Гродзенскай вобласці паступіла каля 13 тысяч зваротаў. У параўнанні з 2020 годам колькасць зваротаў да мясцовай улады знізілася на 4,8 %, а ў аблвыканкам — на 6,4 %. Якасць работы са зваротамі грамадзян, аператыўнасць рэагавання на іх — гэта тыя крытэрыі, па якіх людзі ацэньваюць эфектыўнасць органаў дзяржкіравання. Аналіз работы за мінулы год дэманструе зніжэнне колькасці зваротаў, у тым ліку і паўторных, што, перш за ўсё, сведчыць аб павышэнні якасці гэтай работы. Пытанні эфектыўна вырашаюцца на мясцовым узроўні, і людзям радзей даводзіцца звяртацца ў вышэйстаячыя інстанцыі. Вельмі важна пры рабоце са зваротамі грамадзян пазбягаць адпісак і фармалізму, на ўсе пытанні павінны давацца адказы па сутнасці».*

# Здаровая купель



**Купелі, падобныя на вялікія бондарскія кадкі, абсталяваныя для адпачынку пасля гарачай лазні ў зімовы перыяд, любяць госці аграсядзібы ў вёсцы Заазер'е Сенненскага раёна. Дзеля іх сюды, у лясны куток, прыязджаюць не толькі мясцовыя аматары і знаўцы парыльні, але і жыхары з суседніх раёнаў. Вось і маладыя супрацоўнікі Бешанковіцкага аддзела МНС у чарговы дзень адпачынку пасля дзяжурнай змены вырашылі наведаць заазерскую лазню з яе незвычайнай «балеяй» пад адкрытым небам. Дарэчы сказаць, адмысловыя бочкі-купальні зроблены гаспадарамі гэтай жа аграсядзібы.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Сёння распачынаюцца пазачарговыя сесіі Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.**
- Белтэлерадыёкампанія пакажа XXIV зімовыя Алімпійскія гульні ў Пекіне.
- **НАН Беларусі плануе да канца года перадаць вакцыну ад COVID-19 для карыстання.**
- У Беларусі плануюць стварыць доследную вытворчасць лінейкі айчынных электрамабіляў.
- **«Беларуськалій» запатрабуе ад «Літоўскіх чыгунак» кампенсацыю з-за скасавання кантракта.**

ISSN 1990 — 763X

Год гістарычнай памяці

## «ВІНТ» У НЕБЕ І НА ЗЯМЛІ

### Чым прыцягвае гісторыя ваеннай авіяцыі берастаўіцкіх аматараў тэхнічнай творчасці

**Калі ў жыхароў Берастаўіччыны запытаць, якія цікавыя падзеі тут адбываюцца, яны абавязкова назавуць фестываль радыёкіраваных мадэляў. Захапляльны конкурс і адначасова свята збіраюць удзельнікаў з усяе Беларусі і замежжа. Фестываль стаў сапраўдным брэндам раённага цэнтра і нават унесены ў каляндар спартыўных мерапрыемстваў краіны.**

**Арганізатарам фестывалю шмат гадоў з'яўляецца народны аматарскі калектыў «Вінт», якім кіруе апантаны гэтай справай Аляксандр УНУКОВІЧ. Ён расказаў, што сёлета, у Год гістарычнай памяці, удзельнікі гуртка збіраюцца пашырыць лінейку мадэляў ваеннай авіяцыі, а таксама заняцца вывучэннем іх гісторыі. А яшчэ ў клуба ёсць ідэя стварыць пошукавы атрад і навесці парадак на былым ваенным аэрадроме.**



Фота з архіва героя публікацыі.

СТАР. 12

## Біблія на беларускай мове: «Галоўнае — абапірацца не на прыдуманыя ўяўленні, а на тысячагадовы вопыт набожных папярэднікаў»



**Наш асветнік Францыск Скарына, які здзейсніў выпуск першай для ўсходніх славян друкаванай Біблії, сцвярджаў, што трэба любіць і шанаваць, як святыню, роднае слова, з якім нас літасцівы Бог на свет пусціў.**

**З тых часоў шмат руплівцаў працавала на тое, каб Свяшчэннае Пісанне гучала на роднай мове. У 2019 годзе прэміяй «За духоўнае адраджэнне» былі адзначаны перакладчыкі Біблії на беларускую мову, сярод якіх — доктар філалагічных навук, прафесар БДУ, вучоны сакратар Беларускай Біблійнай камісіі Іван ЧАРОТА. Сёння, калі для беларусаў так важна захаваць культурную самабытнасць і нацыянальную ідэнтычнасць, мы гутарым з Іванам Аляксеевічам пра гісторыю беларускіх біблейскіх перакладаў.**

СТАР. 13

Акцэнты

**Наталля КАЧАНАВА:**

## «МЫ ПАВІННЫ ЗАХАВАЦЬ МІР, СТАБІЛЬНАСЦЬ І СПАКОЙ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ»

**Аб гэтым заявіла ўчора Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, каментуючы журналістам рэакцыю на напружанасць на паўднёвых граніцах нашай краіны і нарошчванне вайсковага кантынгенту па той бок граніцы. Адпаведную заяву яна зрабіла перад сустрэчай з прадстаўнікамі банкаўскай сферы, што прайшла ў сталіцы.**

— Вядома, мы занепакоены сітуацыяй, якая складваецца на нашых паўднёвых граніцах. Пра гэта казаў учора (на сустрэчы з навуковай супольнасцю. — **Заўв. аўт.**) і Прэзідэнт. І гэта не можа нас не хваляваць і не турбаваць, таму што гэта дружалюбны для нас народ. З Украінай нас звязваюць не толькі цесныя гістарычныя, але і родныя сувязі, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Але разам з тым мы выдатна разумеем, што павінны захаваць мір, стабільнасць і спакой на сваёй зямлі. Таму сцягванне войскаў, нагнятанне сітуацыі — гэта, на мой погляд, недапушчальна.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на тым, што голас беларускіх парламентарыяў заўсёды гучыць на міжнароднай арэне.

— Мы, члены Савета Рэспублікі, парламентарыі, звяртаемся перш за ўсё да сваіх калег у гэтых краінах: давайце глядзець праўдзе ў вочы, давайце чуць адно аднаго. Можна вырашаць пытанні перагаворамі за круглым сталом, не выклікаючы адно ў аднаго нейкае непаразуменне, — акцэнтавала яна. — І тыя заявы, якія робяць нашы калегі ва Украіне, — непрамерныя ў адносінах да Беларусі.

Спікер адзначае, што такія паводзіны не адпавядаюць званню дэпутата, які павінен несці праўду людзям.

Дарэчы, звяртае ўвагу Наталля Качанава, ва Украіне сёння мала інфармуюць людзей аб тым, што адбываецца ў Беларусі. Але ж яны павінны ведаць, як жывуць іх суседзі і браты, бо гэта ж не за тысячы кіламетраў, а зусім побач.

Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла: з боку Беларусі ніколі не ішла агрэсія, паколькі наш народ памятае сваю гісторыю і свае карані.

— Мы памятаем, што было на нашай зямлі і не адзін раз, таму мы зробім усё для таго, каб не дапусціць ніякіх ваенных дзеянняў. І калі задумацца, што сёння важна для кожнага чалавека, — вядома, каб быў мір і спакой, каб ты мог быць упэўнены ў сваёй будучыні, — рэзюмавала Наталля Качанава.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Парламенцкі дзённік

## СУПРАЦОЎНІЦТВА ТОЛЬКІ МАЦНЕЕ

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся з паслом Кубы**

**Вітаючы пасла ў Палаце прадстаўнікоў, спікер ніжняй палаты падкрэсліў, што гэта ўжо не першая такая сустрэча. Звярнуўшы ўвагу на тое, што неўзабаве Хуан Вальдэс Фігераа завершыць сваю дыпламатычную місію ў Беларусі, Уладзімір Андрэйчанка выказаў упэўненасць, што ў яго застануцца добрыя ўражанні і ўспаміны аб нашай краіне, гасціннасці беларускага народа.**

— За час работы тут вы зрабілі вельмі шмат для ўмацавання даверлівых адносін паміж Беларуссю і Кубай, — падкрэсліў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — У 2019 годзе пры вашым непасрэдным удзеле адбыўся візіт Прэзідэнта Кубы ў Рэспубліку Беларусь, падчас якога былі абмеркаваны важныя пытанні з Прэзідэнтам нашай краіны. Была створана аснова для далейшай работы — і на міжнароднай арэне ўзаемадзеяння, і ў развіцці эканамічнага, гуманітарнага супрацоўніцтва. Важна, што і ў час вашай работы, і старшынства Рэспублікі Беларусь у Еўразійскім эканамічным саюзе Куба атрымала статус назіральніка.

Уладзімір Андрэйчанка адзначыў і важнасць міжпарламенцкага супрацоўніцтва дзвюх краін. Беларускія парламентарыі гатовыя прыняць з візітам старшыню парламента Кубы, спадара Ласа Эрнандэса. У той жа час рыхтуецца візіт у Кубу, які адбудзецца ў наступным месяцы, намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерыя Міцкевіча.

Гаворачы аб парламенцкіх сувязях, спікер ніжняй палаты падкрэсліў, што апошнім часам мы вельмі прадукцыйна ўзаемадзейнічаем на міжнародных парламенцкіх пляцоўках. Па яго словах, трэба і далей цесна супрацоўнічаць, асабліва гэта датычыцца Міжпарламенцкага саюза Лацінаамерыканскага парламента.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падзякаваў паслу, што той за час сваёй работы ў нашай краіне наладзіў плённыя кантакты з парламенцкімі групамі дружбы Беларусі і Кубы, якія часта прымалі заявы, накіраваныя супраць таго ціску і санкцый, што аказваюцца сёння на Рэспубліку Беларусь. «У будучыні нам трэба больш цесна працаваць па гандлёва-эканамічным пагадненні, згодна з тым планам дзеянняў, які быў падпісаны паміж нашымі ўрадамі, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. — Тым больш ёсць цікавыя праекты: і па сельскай гаспадарцы, і па машынабудаўнічай прадукцыі. Перакананы, што гэтыя кантакты будуць развівацца толькі ў станоўчым кірунку: задзел вамі зроблены добры».

**Вераніка КАНЮТА.**

На слыху

# ГРУЗАПАТОК ПРАЗ БЕЛАРУСЬ РАСЦЕ

**Паток грузавога транспарту праз нашу краіну летась павялічыўся больш чым на 5 % нягледзячы на абмежаванні ў сувязі з пандэміяй, закрыццём пунктаў пропуску па гэтай і іншых прычынах і некаторых санкцыйных мерах. Кіраўніцтва Дзяржаўнага мытнага камітэта падвяло вынікі работы, расказала аб прымяненні навігацыйных пломб, а таксама растлумачыла, з чым звязаны чэргі фур на граніцах.**

### КОЛЬКАСЦЬ МАШЫН РАСЦЕ, ЧЭРГІ ЗАСТАЮЦЦА

Нягледзячы на сітуацыю з ковіднымі абмежаваннямі і закрыццё некаторых пунктаў пропуску па іншых прычынах, летась захоўвалася тэндэнцыя да павелічэння транспартнага грузапатоку праз нашу краіну. У 2021 годзе праз мытную граніцу прайшло больш за 2,4 мільёна грузавых аўтамабіляў — на 5,6 % больш, чым у 2020-м. Аб'ём перавезеных імі тавараў таксама вырас — на 7,7 % і склаў амаль 32 мільёны тон. У рэспубліканскі бюджэт ад мытнай дзейнасці ў 2021 годзе паступіла больш за 10,5 мільярда рублёў, што амаль на 20 % больш, чым у 2020-м.

У сувязі з чэргамі грузавых машын на польскім і літоўскім напрамках летась актыўна развівалі пляцоўкі чакання перад пунктамі пропуску. Сістэма электроннай чаргі створана ў сямі з іх — дзве на беларуска-польскай граніцы (Брузгі і Брэст), дзве на беларуска-латвійскай (Грыгароўшчына і Урбаны), тры на беларуска-літоўскай (Катлоўка, Каменны Лог, Беняконі).

Сітуацыю з чэргамі пракаментаваў **старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ**.

— У нас па ўсіх напрамках — польскім, украінскім, літоўскім, латвійскім — ёсць пагадненні з сумежнай краінай аб колькасці транспартных сродкаў, якія афармляюцца, а гэта значыць прымаюцца да сябе, па кожным пункце пропуску. На ўезд заўсёды афармленне больш складанае, кантроль большы, так што чарга залежыць ад таго, як хутка сумежны бок прымае аўтамабілі. Апошнія два-тры гады ў нас рэгулярна чэргі на літоўскім напрамку, таму што тыя нормы, якія ўстаноўлены ў нашых пагадненнях, калегі не заўсёды выконваюць. Гэта сістэмная праблема. Калі б нормы выконваліся, думаю, такіх чэргаў дакладна не было б, — адзначыў Уладзімір Арлоўскі.

Акрамя таго, з мінулага года літоўскі бок пачаў рэканструкцыю самага вялікага пункта пропуску на граніцы з Беларуссю — «Мядзінінкай». Пасля пачатку рэканструкцыі прапускная здольнасць скарацілася ў два разы — з 500 да 250 аўтамабіляў у суткі.

Што да польскага напрамку, сітуацыя на граніцы звязана з закрыццём палякамі пункта пропуску Кузніца Беластоцкая (з беларускага боку — Брузгі). Да гэтага ў сувязі з ковіднымі абмежаваннямі было закрыта яшчэ два пункты пропуску — Дамачава і Пясчатка. Усё гэта сур'ёзна паўплывала на чэргі на граніцы.

— Закрыццё Брузгоў у лістападзе мінулага года стала нечаканым, перавозчыкі былі не гатовы, тым больш што гэта адбылося ў канцы года, калі найбольшы грузапаток, імпарцёры і экспарцёры імкнуцца закрыць свае кантракты. Так што сітуацыя была вельмі напружаная. У пачатку года крыху лягчэй, але ўсё роўна чэргі ёсць, — сказаў старшыня мытнага камітэта. — Мы на ўезд сваю норму выконваем, стараемся рабіць і больш. Акрамя таго, праведзены шэраг перагавораў на свaім узроўні — як з кіраўніцтвам мытных службаў Польшчы і Літвы, так і па лініі МЗС. Мы прапаноўвалі адкрыць хоць бы адзін з трох закрытых пунктаў пропуску на польскім напрамку і знізіць нагрузку. На жаль, нашы калегі нас не чуюць, прыкрываючыся або ковідам, або мігрантамі, або яшчэ нейкімі пытаннямі, — канстатаваў Уладзімір Арлоўскі.

З беларускага боку на беларуска-ўкраінскай граніцы ў ліпені 2021 года ўведзены ў эксплуатацыю рэканструяваны пункт пропуску Верхні Церабяжоў. У выніку агульная прапускная магчымасць пунктаў пропуску на гэтым напрамку павялічылася на 930 аўтамабіляў у суткі і складае амаль 32 тысячы машын. Сёлета плануецца пабудаваць новы пункт пропуску Аляксандраўка ў Мазырскім рэгіёне замест рэканструкцыі старога.

### МЕХАНІЗМ ПРЫМЯНЕННЯ НАВІГАЦЫЙНЫХ ПЛОМБ АДЛАДЖАНЫ

Першапачаткова нямала пытанняў, у тым ліку арганізацыйных, выклікаў механізм прымянення навігацыйных пломб на транспартных сродках. Як адзначыў Уладзімір Арлоўскі, сёння ён цалкам адладжаны. Час усіх аперацый — ад звароту да аператара і аплаты да навешвання пломбы і яе актывацыі — займае 15—20 хвілін. Ёсць адзінкавыя выпадкі, калі здараюцца чэргі, і працэс можа зацягнуцца да дзвюх гадзін, але гэта здараецца вельмі рэдка.

Трэба сказаць, што пагадненне аб прымяненні навігацыйных пломб для адсочвання перавозак было зацверджана ў канцы 2021 года на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Беларусь пачала іх прымяняць яшчэ ў 2020-м, не чакаючы прыняцця гэтага рашэння ў рамках ЕАЭС.

— Раней мы іх прымянялі толькі адносна перавозчыкаў, па якіх ёсць інфармацыя, што яны парушаюць мытнае заканадаўства. У 2021 годзе мы пашырылі сферу прымянення. Цяпер выкарыстоўваем навігацыйныя пломбы на літоўскім і польскім напрамках, бо там учыняецца больш за ўсё правапарушэнняў у мытнай сферы. Гэты механізм дае магчымасць скараціць колькасць мытнага кантролю непасрэдна на граніцы, суправадзіць транспартны сродак або ва ўнутраны пункт мытнага афармлення, або да выезду з тэрыторыі Беларусі, — патлумачыў Уладзімір Арлоўскі.

З пачатку прымянення механізму навесілі ўжо 235 тысяч навігацыйных пломб. Адначасова кантралюецца каля чатырох тысяч транспартных сродкаў з такімі пломбамі, у суткі імі аснашчаецца каля дзвюх тысяч аўтамабіляў. Кошт для перавозчыка складае 10 базавых велічынь за адну паслугу. Пры фарміраванні цаны за аснову браліся выраб праграмнага прадукту, яго суправаджэнне, купля і эксплуатацыя пломб, зарадка, навешванне, зняцце, дастаўка ў пункты пропуску, кругласутачны маніторынг, выезд на парушэнні.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МЗС Кітая назвала НАТА перажыткам халоднай вайны



Альянс павінен як мага хутчэй адмовіцца ад ідэалогіі той эпохі, адзначыў афіцыйны прадстаўнік ведамства Чжаа Ліцзянь. «НАТА з'яўляецца перажыткам эпохі халоднай вайны, і пашырэнне альянсу з'яўляецца адной з праяў палітікі стварэння блокаў. НАТА — гэта найбуйнейшы ў свеце ваенны альянс, яму даўно пара адмовіцца ад устарэлай ментальнасці часоў халоднай вайны ды ідэалагічных прадузятасцяў, а таксама прыняць больш мер, якія ўнясуць уклад ва ўмацаванне бяспекі і стабільнасці», — сказаў дыпламат. Ён адзначыў, што Кітай выступае за ўсёабдымныя і інклюзіўныя механізмы гарантавання бяспекі. «Спадзяёмся, што адпаведныя бакі ў поўнай меры будуць улічваць законную заклапочанасць адно аднаго ў сферы бяспекі, будуць пазбягаць канфрантацыі і ўрэгулююць разыходжанні, якія між імі існуюць, шляхам раўнапраўнага дыялогу і кансультацый», — падкрэсліў Чжаа Ліцзянь.

### МВФ прагназуе запаволенне росту сусветнага ВУП

Распаўсюджванне амікрон-штама каранавіруса, рост цэн на энерганосьбіты, спад у сектары нерухомасці Кітая і больш павольнае, чым чакалася, аднаўленне прыватнага спажывання, абмяжоўваюць перспектывы глабальнага эканамічнага росту. Пра гэта гаворыцца ў студзеньскім дакладзе Міжнароднага валютнага фонду, паведаміла Euronews. У дакладзе МВФ перагледзеў прагнозы па росце сусветнай эканомікі ў бок паніжэння. Так, згодна з новымі ацэнкамі, сёлета тэмпы росту сусветнага ВУП складуць 4,4 працэнта, у кастрычніцкім прагнозе гэты паказчык быў роўны 4,9 працэнта. У краінах еўразоны ВУП дадасць 3,9 працэнта. «У пачатку трэцяга года пандэміі колькасць загінулых павялічылася да 5,5 млн, а спадарожныя эканамічныя страты, як чакаецца, да канца 2024 года складуць каля $13,8 трлн», — заявіла першы намеснік дырэктара-распарадчыка МВФ Гіта Гапінат. У МВФ таксама ўказалі на магчымасць з'яўлення глабальных рызык, паколькі геапалітычная напружанасць застаецца высокай, а надзвычайная сітуацыя ў сферы клімату, якая працягваецца, сведчыць аб тым, што верагоднасць буйных стыхійных бедстваў застаецца павышанай.

### У Францыі за суткі зафіксавана больш за паўмільёна новых выпадкаў COVID-19

Гэта найвышэйшы паказчык з пачатку пандэміі. Адпаведныя даныя прыводзіць Нацыянальнае агенцтва грамадскай аховы здароўя Францыі, паведаміла ТАСС. Папярэдні антырэкорд быў зафіксаваны 18 студзеня, калі ўлады паведамілі аб 464 тысячах інфіцыраваных за суткі. Сярэдняя захварвальнасць па краіне складае 3,7 тысячы выпадкаў на 100 тысяч жыхароў. Найбольшая колькасць тых, хто заразіўся, фіксуецца ў рэгіёнах Пеі-дэ-ла-Луар на захадзе краіны, Авернь-Рона-Альпы і Праванс-Альпы-Лазурны Бераг на поўдні. З пачатку пандэміі ў Францыі ад наступстваў каранавіруса памерла больш за 128 тысяч чалавек.

# МЫ РОЗНЫЯ, АЛЕ МЫ АДЗІНЫЯ

## Прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў — пра змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю

**Абмеркаванне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь — тэма важная і актуальная для кожнага грамадзяніна краіны, незалежна ад яго нацыянальнасці. Невыпадкова дадзенае пытанне стала вядучым на пасяджэнні кансультатыўнага міжэтнічнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Гэта каардынуючы орган нацыянальна-культурных аб'яднанняў, якія прадстаўляюць нацыянальныя меншасці. Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК расказаў, што па выніках перапісу 2019 года ў краіне пражываюць прадстаўнікі больш як 156 нацыянальнасцяў, дзейнічае больш за 200 грамадскіх культурна-нацыянальных арганізацый.**



Фота БелТА.

«Для людзей, якія з розных прычын апынуліся на беларускай зямлі і знайшлі тут другі дом, вельмі важнае захаванне міру і згоды, якімі мы ганарымся. Ім вельмі важна пачуць ад аўтараў змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю гарантыі захавання міжканфесіянальнага і міжнацыянальнага міру. Прадстаўнік кожнай нацыянальнасці, які жыве ў нашай краіне, мае такія ж правы, як і беларус. У нас няма ніякіх адрозненняў, у нас няма ніякіх канфліктаў», — падкрэсліў Аляксандр Румак. Паводле яго слоў, захаваць міжнацыянальны і міжканфесіянальны мір неабходна, каб кожны чалавек, трапляючы на беларускую зямлю, адчуваў сябе роўным, незалежна ад нацыянальнасці, колеру скуры, расы, адчуваў сябе тут як дома. Таму зразумела, што члены міжэтнічнага савета не маглі пакінуць без увагі змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю.

Удзел у пасяджэнні савета ўзяла член рабочай групы па распрацоўцы змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, кіраўнік Інстытута прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Алена Сямашка. «Мы знаходзімся ў вельмі важным гістарычным перыядзе. Вядома, грамадзяне, прыходзячы на ўчасткі галасавання на рэферэндуме, прымаючы рашэнне, могуць галасаваць сэрцам, давяраючы таму, хто прапануе прадстаўлены варыянт. Аднак важна ўсвядоміць, зразумець, што прапануецца і для чаго. Таму вядзецца актыўная работа ў працоўных калектывах, установах адукацыі і іншых месцах, дзе насельніцтва можа задаць пытанні не толькі тым, хто ўдзельнічаў у распрацоўцы праекта Канстытуцыі, але і іншым адказным службовым асобам, якія валодаюць матэрыяламі», — падкрэсліла яна.

### МЕРКАВАННІ

### «МЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ РАЗАМ»

**Старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Ватра» Уладзіслаў КАДЗІРА** заклікаў усіх грамадзян Беларусі ўдзельнічаць у рэферэндуме. Нагадаем, што ён запланаваны на 27 лютага. «Украінцы, азербайджанцы, армяне — мы ўсе розныя, але мы адзіныя, паколькі жывём на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Я вельмі рады, што беларуская грамадскасць актыўна ўключылася ў абмеркаванне Канстытуцыі. Вельмі важна, што ў Канстытуцыі замацоўваецца неабходнасць захавання гістарычнай праўды. Мы ўсе ведаем, што 2022-гі абвешчаны Годам гістарычнай памяці. І мы будзем рабіць на гэта акцэнт у дзейнасці нашага грамадскага аб'яднання. У нас даволі вялікая суполка, паколькі шмат украінцаў жыве ў Беларусі. Мы захоўваем сваю гісторыю, свята шануем свае традыцыі. Беларусь і Украіна — гэта дзве блізкія краіны, у нас агульнае гістарычнае мінулае, наогул шмат агульнага. Таму мы павінны быць заўсёды разам.

Не толькі ўкраінец, але кожны чалавек, які жыве ў Беларусі і мае грамадзянства гэтай краіны, павінен шанаваць традыцыі, культуру, законы. Канстытуцыя — гэта Асноўны Закон, які мы павінны шанаваць, цаніць. Я заклікаю кожнага прыйсці на рэферэндум і аддаць свой голас. Гэта неабходна, калі мы хочам жыць у квітнеючай, моцнай і прыгожай Беларусі», — адзначыў ён.

### «МЫ З ГЭТЫМ ЗАКОНАМ БУДЗЕМ ДОЎГА ЖЫЦЬ»

На неабходнасць захавання гістарычнай памяці і асабліва праўды аб Вялікай Айчыннай вайне звярнуў увагу і **Георгій ЕГІАЗАРАН**. Ён узначальвае грамадскае аб'яднанне «Мінскае гарадское армянскае культурна-асветніцкае аб'яднанне «Аястан». «Захаванне гістарычнай памяці, захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці сёння вельмі важнае для кожнага чалавека. Гэта дае магчымасць паказаць сваю культуру, расказаць сваю гісторыю і пазнаёміцца з іншай культурай. У Беларусі і Арменіі заўсёды былі добрыя адносіны. Мы разам прайшлі Вялікую Айчынную вайну. За вызваленне Беларусі 13 армян атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. І, безумоўна, мы не можам забыць наш агульны боль. Арменія, як і Беларусь, не дазваляе сабе ніякіх змяненняў ці перапісванняў гісторыі», — канстатаваў ён.

Георгій Егіазаран падкрэсліў, што іх грамадскае аб'яднанне актыўна ўключылася ў абмеркаванне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. Для армян Беларусі гэта вельмі важная тэма. «Мы з гэтым законам будзем доўга жыць. І калі сёння паставімся да яго неяк несур'ёзна, потым будзем шкадаваць. Рэферэндумы не кожны дзень праводзяцца, і трэба грунтоўна да яго паставіцца, разгледзець усе пункты і быць спакойным, што ты зрабіў усё, што неабходна».

### «КОЖНАЯ КРАІНА САМА ВЫРАШАЕ, З ЧЫМ ЁЙ ЖЫЦЬ»

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Асацыяцыя беларускіх карэйцаў» Кімі РЫ** падкрэсліла недапушчальнасць знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы незалежнай краіны. «Кожная краіна сама вырашае, з чым ёй жыць і як ёй жыць. А калі нейкія іншыя сілы ўмешваюцца — гэта зусім нядобра. Мы хочам жыць у сваёй дзяржаве, са сваімі мінусамі і плюсамі, але ў сваёй незалежнай краіне. Таму для ўсіх, хто жыве ў Беларусі, вельмі важныя змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю», — сказала яна. Кімі Ры не абышла ўвагай і захаванне гістарычнай памяці. Яна расказала, што карэйцы, якія жывуць у Беларусі, вельмі паважаюць беларускія традыцыі і асабліва шануюць Дзень Перамогі: «Гістарычную памяць трэба захоўваць абавязкова. Без традыцый, без гісторыі краіна жыць не можа. Неабходна шанаваць гісторыю. Нельга забываць тое, што перажыў народ».




Фота БелТА.

Падчас канструктыўнага дыялогу члены Савета абмеркавалі і іншыя пытанні, важныя для прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, якія жывуць у Беларусі. У прыватнасці, вялікую ўвагу ўдзялілі падрыхтоўцы да XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які пройдзе ў пачатку чэрвеня. Гэты фестываль — выдатны прыклад таго, што ў Беларусі кожны чалавек можа адчуваць сябе дома, незалежна ад нацыянальнасці. А сёння гэта асабліва важна.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «ЛЮДЗІ ГАТОВЫЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У КІРАВАННІ СПРАВАМІ ДЗЯРЖАВЫ»



Фота БелТА.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС правяла ў Салігорску асабісты прыём, паведамляе БелТА.**

«Салігорскі раён — адзін з самых складаных, і я спецыяльна прыехала сюды. Пытанні, якія сёння гучаць, якраз характарызуюць сам рэгіён. Адрозненне гэтага прыёму ад усіх маіх папярэдніх заключаецца ў тым, што ў людзей па некалькі пытанняў», — сказала Вольга Чупрыс.

Жыхар Мінскага раёна звярнуўся з прапановамі па функцыянаванні аграсядзіб у разрэзе Указа Прэзідэнта № 365 «Аб развіцці аграэкатурызму» і падзяліўся думкай, у якім напрамку можна ўдасканальваць дадзеную сферу, звярнуў увагу на існуючыя праблемы і спосабы іх вырашэння.

Неабыякавы да лёсу сваёй краіны салігарчанін агучыў прапановы па ўнясенні змяненняў у Канстытуцыю. Мужчына выказаў сваё меркаванне аб тэрмінах паўнамоцтваў Прэзідэнта, дзейнасці палітычных партый. Таксама ўзняў пытанне па стымуляванні спецыялістаў сферы аховы здароўя, адзначыўшы, што дзяржава ўкладвае вялікія рэсурсы ў іх падрыхтоўку, аднак праблема ўцечкі кадраў за мяжу стаіць для краіны дастаткова востра.

«Мы цяпер масава пачалі абмяркоўваць праект Канстытуцыі, і грамадзяне натхніліся, ідуць ужо не са скаргамі, а з канкрэтнымі прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства, вырашэнні праблем, і не толькі асабістых. Гэта сведчыць аб тым, што людзі гатовыя ўдзельнічаць у кіраванні справамі дзяржавы. Мяне гэта радуе, таму што вырашэнне праблемы кожнага — гэта добра, але разуменне таго, што твая праблема звязаная з праблемамі іншых людзей, — яшчэ больш важна. Мне хацелася б улічыць такія пажаданні», — падкрэсліла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.




**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

# «НАША СУПРАЦОЎНІЦТВА — ВУЛІЦА З ДВУХБАКОВЫМ РУХАМ»

**У бягучым годзе стартуе рэалізацыя 28 інтэграцыйных праграм Саюзнай дзяржавы, якія былі зацверджаны на Вышэйшым дзяржсавеце мінулай восенню. Але не толькі гэта стала тэмай нашай гутаркі з начальнікам упраўлення Расіі Міністэрства замежных спраў Беларусі Алегам ІВАНОВЫМ.**



## «ТРЭБА СТАВІЦЬ АМБІЦЫЙНЫЯ МЭТЫ»

***— Алег Мікалаевіч, што ўваходзіць у кола кампетэнцый вашага ўпраўлення?***

— Мы курыруем усё, што звязвае нашы інтарэсы з Расійскай Федэрацыяй: супрацоўніцтва ў цэлым — як на двухбаковым трэку, так і ў рамках інтэграцыйных структур у шматбаковых фарматах: СНД, ЕАЭС, АДКБ.

Толькі наша ўпраўленне займаецца Саюзнай дзяржавай. Не ўсе ўсведамляюць, што гэта інтэграцыйная структура па сваім бюджэце не саступае бюджэту СНД, мае свой апарат, рэальныя праграмы і праекты ў эканоміцы, якія ствараюць вельмі добрыя прадукты. Адным з недахопаў Саюзнай дзяржавы з'яўляецца слабы піяр сваёй дзейнасці. Таму мы выносім на парадак дня стварэнне інтэграцыйнага медыяхолдынга. Гэта будзе камерцыйны праект. Калі мы яго рэалізуем у найбліжэйшы час, будзе вельмі здорава, бо і Саюзная дзяржава, і ў цэлым нашы ўзаемаадносіны з Расіяй маюць патрэбу ў большым піяры, чым гэта ёсць цяпер.

Французы кажуць: «Les affaires sont les affaires» — справа ёсць справа, але на торце павінна быць вішанька. Тое, што мы робім у рамках Саюзнай дзяржавы — вельмі добра, але людзі павінны бачыць, да чаго інтэграцыя вядзе і чым займаюцца нашы структуры.

> **«У адносінах з Расіяй у нас няма так званых чырвоных ліній. Але мы праводзілі, праводзім і будзем праводзіць палітыку незалежнай суверэннай дзяржавы, і гэта не зменіцца».**

Цяпер у кола распараджэння ўпраўлення дадаліся 28 інтэграцыйных праграм, падпісаныя мінулай восенню. Гэта галіновыя праграмы, аснова іх выканання ляжыць на тых ведамствах, у кампетэнцыю якіх яны ўваходзяць. Разам з тым, патрэбная не проста каардынацыя, але агульнае бачанне развіцця.

Нядаўна, напрыклад, адбылася вельмі цікавая нарада ў нашым МАРГу па стварэнні наднацыянальнай беларуска-расійскай біржы — прынцыпова новы кірунак, які патрэбны бізнесу. Падчас нарады высветлілася, што нацыянальныя заканадаўствы не дазваляюць нам аб'ядноўвацца так, як таго хацелі б спецыялісты. Наша роля ў гэтай сітуацыі — стварыць міжнародна-прававы «парасон», які дазволіць рухацца наперад. Асабліва гэта важна, калі мы будзем прыцягваць да двухбаковых праграм і праектаў іншыя краіны. Бо Саюзная дзяржава, як і ўсе інтэграцыйныя аб'яднанні на постсавецкай прасторы — СНД, АДКБ, ЕАЭС, адкрытая для далучэння, гэтак планавалася ад самага пачатку. Ніхто ніколі тут не ставіў цвёрдых рамак па абмежаванні членства.

> **«Мы прапрацоўваем лагістычныя транспартныя калідоры з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход праз Беларусь, у тым ліку ў рамках Саюзнай дзяржавы».**

Некаторыя з 28 праграм маюць рамачную форму, якая толькі паказвае кірунак руху. Тая ж біржа будзе развівацца і будзе адкрытая для ўсіх, каму гэта цікава. Разумею, што мы не адразу выйдзем на ўзровень Лонданскай біржы або Нью-Ёркскай, але трэба ставіць перад сабой вельмі амбіцыйныя мэты. Мне вельмі падабаецца выказванне пра тое, што дарогу адужае той, хто ідзе па ёй. Каб нечага дасягнуць, трэба не баяцца рушыць наперад.

***— Адміністрацыйна-прававы «парасон» — гэта тыя прыкладна 400 заканадаўчых актаў, якія патрэбныя для рэалізацыі 28 падпісаных мінулай восенню праграм?***

— Так. Лічба названая зыходзячы з работы ў ЕАЭС. Іх можа быць 320 або 510, гэта залежыць ад таго, што нам спатрэбіцца мяняць для рэалізацыі дадзеных праграм.

***— Здавалася, што ўжо шмат зроблена па набліжэнні заканадаўстваў у рамках ЕАЭС. І зноў перад намі тыя ж задачы...***

— Я вам больш скажу: ЕАЭС будаваўся зыходзячы з нормаў, прынцыпаў і правілаў Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Мы тут не адкрылі Амерыку. І ўсё роўна спатрэбілася шмат часу, каб знайсці кампраміс паміж нацыянальнымі інтарэсамі і гэтымі нормамі, прынцыпамі і правіламі. Тое самае і тут.

## ЛІЧЫЦЕ РОЎМІНГ АДМЕНЕНЫМ

***— А некаторыя пытанні, як, напрыклад, адмена роўмінгу, увогуле аказалася складана вырашыць...***

— Трэба заўважыць, што сёння роўмінгам карыстаюцца не так, як, скажам, пяць гадоў таму, або дзесяць, калі гэта сапраўды было актуальна. Рашэнне аб адмене роўмінгу было прынята ў 2019 годзе, у 2020-м пачалася тэхнічная работа і да канца года былі зніжаны тарыфы на сеткавы трафік у 20 разоў (з 15 да 0,5 цэнта) і ад двух да 20-кратнай велічыні была зніжана абаненцкая плата для карыстальнікаў роўмінгу. Аператары прапануюць лічыць гэта адменай роўмінгу.

***— Напэўна, лагічна, калі нацыянальны бізнес шукае падтрымкі ў сваёй дзяржавы.***

— Разам з тым, усе разумеюць, што здаровая канкурэнцыя ідзе на карысць развіццю эканомікі. Так, вытворцы спрабуюць апеляваць да заканатворцаў. Акрамя таго, у нас, у адрозненне ад Расіі, скажам, больш сацыяльна арыентаваная дзяржава. Бізнес няссе значную сацыяльную нагрузку. Знаходзіць разумны баланс паміж нашымі сацыяльнымі абавязацельствамі і міжнароднымі, нават у рамках двухбаковых адносін, дастаткова складана.

Яшчэ адзін адчувальны аспект — удзел у дзяржаўных закупках. У Расіі ёсць магчымасць стымуляваць сваіх вытворцаў. Паступленні ў яе дзяржаўны бюджэт за кошт сыравіннага экспарту дастаткова высокія. І тут мы зноў апынаемся ў няроўных умовах. Расійскія вытворцы, якія атрымліваюць датацыі ў рамках дзяржпраграм, маюць перавагі. Паўстае пытанне: уключацца ў гэтыя праграмы альбо шукаць іншы шлях для ліквідацыі няроўных умоў.

Чамусьці лічыцца, што рынчанасць эканомікі Расіі вышэйшая за беларускую. Але абарона свайго вытворцы там таксама вельмі жорсткая. Напрыклад, 1 студзеня прынята рашэнне аб забароне вывазу лесу з Расіі. Нават у краіны ЕАЭС. Хоць мы дамаўляліся пра адзіную прастору для руху тавараў.

Мы ідзём у адным кірунку (сацыяльная арыентаванасць дзяржавы, свабода прыватнай ініцыятывы, развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва), тым не менш, заканадаўства ў некаторых сферах разыходзіцца дастаткова выразна.

Мы заўсёды ганарыліся тым, што сацыяльнае ўзаемадзеянне Беларусі і Расіі можа з'яўляцца ўзорам інтэграцыйных трэндаў. Першапачаткова стваралі роўныя магчымасці для работы, жыцця, вучобы, сацыяльнай абароны, медыцынскага абслугоўвання і падобнае. Аднак рэгуляванне некаторых сацыяльных аспектаў разышлося настолькі моцна, што патрэбныя ўжо палітычныя рашэнні, каб іх наблізіць. Напрыклад, у Расіі страхавая медыцына, а ў нас захоўваецца дзяржаўная бясплатная.

Разам з тым, летась наш тавараабарот перавысіў паказчык дапандэміяй 2019 года. Гэта сведчыць пра тое, што нам удаецца здымаць бар'еры, якія ўзнікаюць.

Калі гучаць папрокі ў тым, што ў справе будаўніцтва Саюзнай дзяржавы гадамі размовы пра адно і тое ж, але нічога не робіцца, — гэта няпраўда. Работа ідзе ўвесь час. Але ў некаторых галінах гэта разнахуткаснае развіццё, у некаторых — адрозніваюцца шляхі. На мой погляд, адна з асноўных асаблівасцяў у тым, што мы, беларусы, адразу абазначылі сацыяльную арыентаванасць развіцця і эканомікі, і ў цэлым дзяржавы. Пад гэта будавалася заканадаўчая база. І ўсё ж такі, законы глабалізацыі — універсальныя. Яны прымушаюць набліжацца, тым больш нас, тым больш ва ўмовах знешняга ціску.

## УРОК НА БУДУЧАЕ

***— Аднак беларусам па-ранейшаму свабодна не перасекчы расійскую граніцу на аўтамабілі.***

— Мы ўвесь час працуем над пашырэннем спіса катэгорый, для якіх адкрыта аўтамабільныя зносіны. Цяпер на работу ў Расію могуць прыязджаць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Акрамя таго, паступова аднаўляюцца пасажырскія маршруты, якія былі даўно закрытыя, — нядаўна зноў пачаў ездзіць цягнік паміж Мінскам і Мурманскам. Першымі былі адкрыты авіязносіны.

***— Яшчэ адно цяжкае для разумення абывацеля пытанне — непрызнанне ў Расіі беларускіх сертыфікатаў аб прышчэпках ад ковіду.***

— Так атрымалася з-за таго, што ў нас уласныя база даных і лічбавыя падыходы да тэмы ковіду. У расіян гэта зроблена на прынцыпова іншых платформах. Цяпер вядуцца перагаворы пра спалучальнасць беларускай і расійскай платформаў, пра тое, каб у Расіі прызнавалі нашы QR-коды аб вакцынацыі, нашы пасведчанні аб прышчэпках. Мяркую, пытанне будзе вырашана. Яно ляжыць не ў палітычнай плоскасці. Гэта ўрок на будучае: як толькі пачалася пандэмія, трэба было дамовіцца аб распрацоўцы адзінай платформы.

Вось чаму мы сёння, пры стварэнні той жа біржы, кажам пра адзіную софт-платформу — праграмнае забеспячэнне павінна быць адным адразу.

## ПАТРЭБНЫЯ ЯШЧЭ СЯБРЫ

***— Вы казалі, што знешні ціск садзейнічае збліжэнню дзвюх краін...***

— Так, ва ўмовах санкцыйнага ціску ступень інтэграцыі ўзрастае. Наглядны прыклад — пераарыентацыя патокаў нашых грузаў на расійскія экспартныя тэрміналы. Калі б гэта не было зроблена дастаткова хутка, для нас адмова Літвы была б балючай. Гэта толькі адзін з кірункаў. Беларусь — экспартаарыентаваная краіна, і да нядаўняга часу была прывабным лагістычным хабам, у тым ліку для перавалкі грузаў з Кітая ў Еўропу. Пасля 2020 года ўся гэтая лагістыка паўстала пад пытаннем. Таму хуткая дамоўленасць з Расіяй многае значыць.

***— Але ці не былі расіяне зацікаўленыя, каб мы выкарыстоўвалі іх марскія парты?***

— Адной толькі зацікаўленасці мала. Патрэбныя магчымасці: прапускная здольнасць чыгункі, дастатковая колькасць вагонаў, прымальныя тарыфы. Расіяне гатовыя нам дапамагчы, але для таго каб дапамога была эфектыўнай, патрэбная платформа. Наш уваход у расійскія лагістычныя схемы — добра. Мы прапрацоўваем лагістычныя транспартныя калідоры з поўначы на поўдзень і з захаду на ўсход праз Беларусь, у тым ліку ў рамках Саюзнай дзяржавы.

***— Гэта і ёсць тое самае плячо, якое нашай краіне падставіла Расія ў складаны для нас час?***

— Так. Калі згадаць выказванне, якое прыпісваюць Аляксандру III: «У Расіі толькі два саюзнікі — яе армія і флот», то сёння гэта не працуе ні для адной краіны. Нават для такой супердзяржавы, як Расія. Патрэбныя яшчэ сябры. Так, мы непараўнальныя па тэрыторыі, па эканамічнай сіле, але як мы можам разлічваць на плячо Расіі, так і яна можа разлічваць на нас у шэрагу выпадкаў. І яна гэта робіць. Тыя ж лагістычныя калідоры — яны задумваюцца і для расійскага экспарту на Захад, і для атрымання грузаў адтуль.

***— Відавочна, што Расія даражыць добрымі адносінамі з Беларуссю. Але як у дадзенай сітуацыі не трапіць у залежнасць ад Расіі там, дзе мы таго не жадаем?***

— У адносінах з Расіяй у нас няма так званых чырвоных ліній. Але мы праводзілі, праводзім і будзем праводзіць палітыку

незалежнай суверэннай дзяржавы, і гэта не зменіцца. Па-першае, гэта закладзена ў нашых асноўных дакументах, такіх як Канстытуцыя. Да таго ж ужо вырасла пакаленне людзей, для якіх вяртанне ў любыя імперскія абдымкі, ці то заходнія, ці то ўсходнія, непрымальныя. Мае дзеці не бачаць сябе ў іншай краіне, акрамя незалежнай Беларусі. Гэта датычыцца ўсёй сучаснай адукаванай моладзі, і змяніць тое ў цяперашніх умовах немагчыма. Які б ні быў знешні ціск.

Калі ў Расіі гучаць заклікі наконт таго, што надышоў час пераходзіць да наступнай стадыі інтэграцыі: адзіная валюта, саюзны парламент, як вянец — адзіная Канстытуцыя, разважны расіянін, пачынаючы ад кіраўніцтва краіны і заканчваючы палітыкамі, разумее, што гэта не проста нерэальна, але такія заклікі не нясуць пазітыву. Расіяне цудоўна разумеюць, што лішні ціск па законах фізікі выклікае лішняе супраціўленне. Вядома, палітычных дыскусій на гэту тэму ніхто не адмяняў. Асабіста я не лічу, што ў спрэчках нараджаецца ісціна, але абмяркоўваць, дыскуціраваць можна і, напэўна, трэба. Тым не менш, размова пра больш глыбокую палітычную інтэграцыю пакуль не ідзе. І пытанне такое расійскім бокам не ставіцца.

І ў 1990-х, і цяпер мы кажам, што працэс набліжэння павінен быць паэтапным. І пачынацца ўсё павінна з эканомікі, з таго, што можна патрымаць у руках. Па меры развіцця эканамічных прадпасылак будуць далейшыя інтэграцыйныя крокі.

Тая ж біржа: спачатку трэба вызначыць, чаго мы хочам. Потым — стварыць адпаведнае заканадаўства, аб'яднаць тэхнічную базу. Пасля мы можам казаць, што кіраўніцтва гэтай біржы будзе выступаць у якасці наднацыянальнага органа. Любыя палітычныя праекты жыццяздольныя тады, калі маюць эканамічны базіс. У савецкай гісторыі шмат таму пацвярджэнняў.

Той жа саюзны парламент, пра які цяпер успомнілі, прадугледжвае адзіныя выбары, гэта значыць, гаворка фактычна пра грамадзян адной краіны. Пра што не проста дачасна казаць, нам да адзінага грамадзянства крочыць яшчэ вельмі доўга.

Непахіснай засталася ўстаноўка на суверэннае развіццё краіны і ў праекце Канстытуцыі, які выносіцца на рэферэндум.

Мы не адмаўляем магчымасць стварэння нейкіх палітычных надбудоў у рамках Саюзнай дзяржавы, але не ставім ніякіх часавых рамак. Сёння ў нас ёсць дакладная работа па 28 праграмах. У грамадства маецца запыт на кааперацыйныя сувязі, партнёрскія адносіны ў бізнесе, саюзніцкія — на знешнім контуры.

## «ЧЫМ ЛЕПШ РАЗУМЕЕМ, ХТО МЫ, ТЫМ БОЛЬШ ВЫРАЗНА — ЧАГО ХОЧАМ»

— Летась, ва ўмовах сусветных абмежаванняў, выкліканых пандэміяй, нарадзіўся вельмі цікавы вопыт выкарыстання саюзнага патэнцыялу ў сферы спорту. У нас даўно праводзіліся спаборніцтвы на Кубак Садружнасці, летась правялі па барацьбе — узялі ўдзел 16 камандаў! Атрымалася вельмі прадстаўнічае мерапрыемства. Усе засталіся задаволеныя і пажадалі працягнуць і пашырыць спектр. Так наша двухбаковае ядро абрастае вонкавай прывабнасцю. Гэта сведчыць аб тым, што саюзніцкія адносіны — не толькі палітычны праект, але гэта сапраўды цікава.

Беларуска-расійскае ўзаемадзеянне ахоплівае практычна ўсе сферы жыцця і развіцця грамадства. Мы рыхтуем вельмі добрую касмічную праграму з удзелам беларускага касманаўта. Акрамя таго, абмяркоўваем праграму па стварэнні касмічнага апарата дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з унікальным распазнаваннем. Гэта працяг справы, распачатай двойчы Героем Савецкага Саюза Пятром Клімуком (я знаёмы з ім асабіста — вельмі харызматычны чалавек!), і разам з тым — выхад на зусім іншы ўзровень кааперацыі, дзе ўсё адразу будуецца на адзіных прынцыпах. Супрацоўніцтва ў такіх сферах паказвае, што мы паўнацэнныя партнёры.

Самае галоўнае — ёсць гатоўнасць вырашаць пытанні. Важнае разуменне абодвух бакоў, што наша супрацоўніцтва — вуліца з двухбаковым рухам. Гэта і папярэджвае завышаныя чаканні, і не дазваляе гарачым галовам выязджаць на «сустрэчку». Бо калі ты парушаеш правілы дарожнага руху, то ствараеш праблемы не толькі іншым удзельнікам, але і сабе.

**«Разам з тым, летась наш тавараабарот перавысіў паказчык дапандэмійнага 2019 года. Гэта сведчыць пра тое, што нам удаецца здымаць бар'еры, якія ўзнікаюць».**

***— Ці не запаволіць рэалізацыю 28 саюзных праграм унутрыпалітычная перабудова нашай краіны па выніках рэферэндуму?***

— Гэта паралельныя працэсы, падобна да таго, як расце дрэва, на якім адначасова распускаецца лісце і спее плод. Гэтыя працэсы нават узаемазвязаныя. Унутранае развіццё нашага грамадства і інтэграцыйнае ўзаемадзеянне з Расіяй — працэсы, якія могуць даваць сінергетычны эфект. Чым лепш разумеем, хто мы і дзе, тым больш выразна разумеем, чаго хочам ад нашых партнёраў. Сінергічнасць тут яшчэ і ў разуменні таго, што лепш рухацца ў адным кірунку. Расіяне, калі ўступаюць у кааперацыйныя сувязі, нешта бяруць ад нас. Мы нездарма ганарымся сваім інтэлектуальным патэнцыялам. Калі прадукт, створаны ў нашай сістэме, выкарыстоўваецца за мяжой — гэта дабаўленая вартасць. І часта прадукт можа выспець толькі ва ўмовах уласнай сістэмы.

***— У сферы беларуска-расійскага супрацоўніцтва важнае месца займаюць сувязі паміж рэгіёнамі.***

— Рэгіянальнае ўзаемадзеянне — дадатковы элемент, на які ў меншай ступені ўплываюць палітычныя ўзаемаадносіны і нават пандэмійныя абмежаванні.

У 2022 годзе Беларусь ужо наведаў кіраўнік Рэспублікі Тыва. Хутка адбудуцца візіты кіраўнікоў Санкт-Пецярбурга і Чувашыі.

Сёлета ў Гродне мы будзем праводзіць ужо дзявяты Форум рэгіёнаў дзвюх краін. У леташні пандэмійны год у рамках рэгіянальнага форуму было падпісана кантрактаў на 800 мільёнаў долараў. Гэта значыць да тых традыцыйных сувязяў, якія былі заўсёды паміж краінамі, форум дадаў амаль мільярд. Толькі летась 33 беларускія дэлегацыі наведалі расійскія рэгіёны і 34 расійскія дэлегацыі прыязджалі да нас. Сёлетні форум плануецца правесці ў вочным фармаце. Акрамя традыцыйных мерапрыемстваў, упершыню адбудзецца маладзёжны форум. Жыццё пакажа, наколькі ён будзе запатрабаваны, але тое, што ўвесь час з'яўляюцца новыя элементы, якія потым пераймаюць іншыя краіны, пра многае сведчыць. Цяпер рэгулярна праходзяць расійска-казахстанскія форумы, узбекска-таджыкскія...

Форумы ствараюць умовы для жывых зносін, што не заменяць ніякія сучасныя камунікацыйныя тэхналогіі. Калі ты глядзіш чалавеку ў вочы, размаўляеш з ім непасрэдна, верагоднасць дасягнення дамоўленасці большая, чым пры зносінах праз экран манітора. Акрамя таго, форум забяспечвае прававыя ўмовы, што таксама вельмі важна.

На рэгіянальных форумах часам развіваюцца гарызантальныя сувязі і ў іншых сферах, напрыклад, па падрыхтоўцы спецыялістаў. Мы мала ведаем пра ўральскія ВНУ, або расіяне — пра нашу сельгасакадэмію ў Горках. А яны не горшыя за сталічныя і маюць свае перавагі. Яшчэ з савецкіх часоў быў папулярны тэрмін «народная дыпламатыя». Рэгіянальныя сустрэчы паказваюць, што гэта якраз працуе.

***— З канца мінулага года стала вядома пра змену расійскага пасла ў нашай краіне. Навіна была хутка падхопленая СМІ...***

— У дыпламатыі не заведзена абмяркоўваць новага пасла да ўручэння даверчых грамат кіраўніку дзяржавы.

За апошнія тры гады Барыс Грызлоў — чацвёрты расійскі пасол у нашай краіне. Ён дастаткова добра ведае беларускую праблематыку, бо шмат гадоў быў старшынёй Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі. Таму, мяркую, яму не трэба ўваходзіць у курс спраў. Мне здаецца, ніводнаму расіяніну, як і беларусу, не трэба доўга ўваходзіць у курс спраў суседняй краіны.

***— Да нядаўняга часу вы працавалі паслом у Таджыкістане, што думаеце пра сітуацыю ў гэтай краіне ў святле нядаўніх падзей у рэгіёне?***

— У Таджыкістане вельмі цвёрдая цэнтральная ўлада плюс абсалютны давер да кіраўніцтва краіны. Так, у краіны дастаткова праблем, іх, у тым ліку, дадае паўднёвы сусед, з якім граніца 1400 кіламетраў. Але характэрна, што калі талібы прыйшлі да ўлады ў Афганістане, таджыкі, яшчэ да таго як бежанцы пачалі пераходзіць раку, разгарнулі для іх лагеры, падрыхтавалі коўдры і муку. І гэта не самы багаты народ. Рабілі без запрашэння заходніх карэспандэнтаў і заклікаў да Упраўлення вярхоўнага камісара па справах бежанцаў ААН. Пазней УВКБ падключылася, але грошай абяцаных так і не дало.

Паўднёвы сусед дадае Таджыкістану не столькі самі праблемы, колькі іх чаканне. Але ступень даверу насельніцтва да кіраўніцтва ў краіне вельмі высокая. Да таго ж, не магу сабе ўявіць там тое, што адбылося ў Казахстане, — двухкратнае павышэнне цаны на сацыяльна значны тавар. Не магу ўявіць сітуацыю, калі таджыкі выйдуць на вуліцу і выступяць супраць дзеючай улады. Так, там больш рэлігійных экстрэмістаў, чым у Казахстане, але, разам з тым, сілавыя ведамствы там не дапусцяць, каб іх білі палкамі або выганялі з будынка, і ўсе гэта ведаюць.

Таджыкі перажылі грамадзянскую вайну, таму добра разумеюць, што такое грамадскія беспарадкі. Памяць пра трагічныя падзеі — найлепшы стрымальны фактар. Таму там падобных хваляванняў не будзе.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «ЛЮДЗІ НАТХНЯЮЦЦА ГЭТАЙ АЎРАЙ»

## Палац Незалежнасці працягвае сустракаць гасцей

**Учора экскурсію па рэзідэнцыі Прэзідэнта Беларусі правялі для супрацоўнікаў, курсантаў, ветэранаў Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС і прадстаўнікоў Міністэрства лясной гаспадаркі. Па залах палаца наведвальнікаў вадзіла прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля ЭЙСМАНТ.**



Фота БелТА.

Курсант Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС Максім Дрыло расказаў карэспандэнту «Звязды», што зараз ён і яго таварышы праходзяць трохмесячную падрыхтоўку для таго, каб заступіць на службу ў МУС. Візіт у палац — свайго роду ўзнагарода за добрыя вынікі ў падрыхтоўцы. «На экскурсію запрасілі найбольш паспяховых у вучобе курсантаў. Напрыклад, ёсць прадстаўнікі Дэпартамента аховы МУС, падраздзяленняў міліцыі грамадскага парадку», — расказаў падрабязнасці курсант.

Хлопец дадае, што падчас экскурсіі можна прасачыць гісторыю не толькі ўзвядзення Палаца Незалежнасці, але і працэс станаўлення нашай дзяржавы. «Сёння мы бачым, як культура пакідае адбітак у гісторыі на прыкладзе Палаца Незалежнасці», — заўважае Максім Дрыло.

Старшы інспектар па падрыхтоўцы кадраў Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС Максім Губар акцэнтуе, што пабываць на экскурсіі — ганаровая магчымасць для курсантаў установы. Сваіх будучых калег ён называе мэтанакіраванымі асобамі, якія жадаюць стаць абаронцамі Айчыны, а некаторыя — і афіцэрамі МУС.

Максім Губар падзяліўся ўражаннямі ад наведвання рэзідэнцыі кіраўніка краіны. Асабліва, адзначае суразмоўца, яго ўразіў музей палаца, зала, дзе праходзіла сустрэча Нармандскай чацвёркі. «Зала сустрэчы вельмі прыгожая па колеры. Там адчуваецца атмасфера той важнай падзеі», — дадае Максім Губар.

Супрацоўнік цэнтра падкрэслівае: рашэнне вадзіць экскурсіі па палацы — выдатная ідэя кіраўніка краіны. «Людзі павінны прыходзіць, глядзець, бо гэта наш набытак. Такі велічны палац павінны наведваць і малыя, і дарослыя», — кажа Максім Губар.



Фота БелТА.

Прадстаўнічая група наведвальнікаў была і ад Міністэрства лясной гаспадаркі — заяўка на экскурсію налічвала больш за 100 прозвішчаў. Сярод іх быў і першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр Драгун. Ён расказаў, што на базе Рэспубліканскага цэнтра павышэння кваліфікацыі працаўнікоў лясной гаспадаркі паводзіцца семінар-нарада з кіраўнікамі ідэалагічнага сектара лясгасаў, абласных лесагаспадарчых аб'яднанняў.

«У рамках гэтага семінара мы папрасілі наведаць палац, нам адказалі — далі магчымасць паглядзець Палац Незалежнасці. Прысутныя тут — спецыялісты, якія на месцах арганізоўваюць ідэалагічную работу ў нашых працоўных калектывах, і яны заўсёды на рубяжы працы з людзьмі», — кажа першы намеснік міністра.

Суразмоўца адзначае, што і сам ён першы раз у Палацы Незалежнасці — і гэта незабыўнае ўражанне: «Людзі натхняюцца гэтай аўрай. Яны вельмі радуюцца, што ў першы раз працаўнікі лясной галіны трапілі ў настолькі знакавае месца, па сутнасці, галоўны будынак краіны. Яны вельмі ўражаныя. Я думаю, гэта становіча адаб'ецца на іх ідэйна-маральных перакананнях».

**Марыя ДАДАЛКА.**

## БЛОНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

**1 марта 2022 года**

проводит **аукционные торги** по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома с расположенным на нем незавершенным незаконсервированным капитальным строением гражданам Республики Беларусь, расположенного в д. Заречье, Пуховичского района Минской области

| № лота | Адрес земельного участка с расположенным на нем незавершенным незаконсервированным капитальным строением | Площадь (га) | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (рублей) | Затраты | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Д. Заречье, ул. Вишневая, 11.** Кадастровый номер: 624480801601000516, Объем (площадь) строения: 384 куб. м (кв. м), готовность строения: 12 %, фундамент: бетон | 0,1457 | Сети электроснабжения, газоснабжение, водоснабжение | 12880,92 | 2 010,70 + публикация в СМИ | 1288,09 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, гражданином – документ, содержащий его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования, представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Аукцион состоится **1 марта 2022 года в 10.00** по адресу: аг. Блонь, ул. Садовая, д. 4А, Пуховичского района Минской области.

Задаток перечисляется на р/с BY13AKBB36006250200050000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 600177637, ОКПО 04430996 код платежа 04901 в срок до **25 февраля 2022 г.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **25 февраля 2022 года** до 17.30 по вышеуказанному адресу.

Контактные телефоны: (801713) 5-60-51, 4-44-55, 4-46-46.

Сайты Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Пуховичского районного исполнительного комитета.

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры по земельным участкам, подлежат возмещению в установленном законодательством порядке.

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

***Место проведения***: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 66-95. ***Форма проведения:*** открытый конкурс. ***Предмет торгов:*** право на заключение договора купли-продажи объекта торгов. ***Наименование объекта торгов:***

**Квартира с инвентарным номером 500/D-111515**

г. Минск, ул. Жилуновича, 35-13.

***Сведения об объекте:*** общая площадь: 27,6. ***Дата и время проведения торгов:*** 7.02.2022 в 10.00. **Начальная цена** (сумма в белорусских рублях, эквивалентная): 47 000 долларов США по курсу НБ РБ на день проведения торгов. ***Задаток:*** 1000,00 белорусских рублей. ***Организационный сбор:*** 2600,00 белорусских рублей. ***Срок заключения договора купли-продажи:*** 30 рабочих дней с момента утверждения протокола. ***Расчеты за объект:*** в день заключения договора купли-продажи. ***Передача объекта:*** 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи. ***Срок снятия с рег. учета***: 14 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи. ***Окончание приема заявок***: 7.02.2022 в 9.30. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав оплачиваются: заказчиком и победителем (единственным участником) в равных долях. ***Иные условия проведения объявленных торгов*:** срок возможного отказа от проведения торгов до момента окончания приема заявок. Право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с Порядком организации и проведения торгов, утвержденным приказом директора ООО «ЦентрСитиБай» от 06.04.2018 г. № 2. К участию в торгах допускаются лица, внесшие задаток и подавшие заявку на участие в торгах, а также представившие организатору заверенную банком копию платежного поручения или соответствующую квитанцию о перечислении задатка. Организационный сбор уплачиваются победителем (единственным участником торгов) в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола. Сумма задатка учитывается при окончательном расчете между победителем (единственным участником торгов) и организатором. Задаток перечисляется на р/с: BY35MTBK30120001093300089651, ЗАО МТБанк, Код MTBKBY22, г. Минск, ул. Толстого, д. 10, УНП 193056974. **Организатор: общество с ограниченной ответственностью «ЦентрСитиБай»,** УНП 193056974, **тел. +375 (17) 231-73-93, e-mail: info@centrcity.by, www.centrcity.by**

---

### ДОПОЛНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ, опубликованную в газете «Минский курьер»» № 140 (3502) от 04.12.2020 (с дополнениями, опубликованными в газете «Минский курьер» № 149 (3511) от 29.12.2020)

УНП 192400611

**Сведения о застройщике**

Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за № 192400611.

**Сведения об объекте долевого строительства, предлагаемого для заключения договора создания объекта долевого строительства**

Для привлечения дольщиков к строительству по договору создания объекта долевого строительства для граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предлагается:

офисное помещение общей площадью 68,58 кв. м.

Стоимость строительства 1 кв. м общей площади офисного помещения составляет **3 700,00** бел. руб. с НДС.

**Условия оплаты**: внесение 100 % стоимости объекта долевого строительства в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Типография «Победа» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ ПРОИЗВОДСТВЕННОГО УЧАСТКА

*(в состав входят: пристройка, склад, гараж, забор, тротуар, калитка, ворота, асфальтное покрытие)*

**общей площадью 223,9 кв. м, с инв. № 633/С-10471, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624050100001000113 (право постоянного пользования) площадью 0,1103 га по адресу: Минская область, Мядельский район, г. Мядель, ул. Юбилейная, 6.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **32 736,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **3 273,60** бел. руб.). *Цена снижена на 60 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016 9330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 05.02.2021, 08.05.2021.

Аукцион состоится **03.03.2022** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **02.03.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра (8029) 339 76 42.**

УНП 600074908

---

**Коммунальное унитарное дочернее предприятие**

**«Управление капитального строительства Запад»**

**информирует о приостановке действия**

изменений и дополнений в проектную декларацию, опубликованных в газете «Звязда» № 175 (29544) от 11.09.2021, по жилому дому «Корабль» по г. п. № 3.1 в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко–ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 2-я очередь строительства. Жилые дома «Корабль» №№ 3.1, 3.2 по г. п., торгово-общественные помещения №№ 5.1, 5.2, 5.3 по г. п.» **с 27.01.2022.**

УНП 192400611

---

И З В Е Щ Е Н И Е  О  П Р О В Е Д Е Н И И  А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна №** 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) **проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе**:

- **цех металлообработки № 2** *(составные части и принадлежности: пристройка, навес, дымовая труба)*, **общей площадью 1222,0 кв. м с инв. № 630/С-46869, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/4.**
- **здание склада нефтепродуктов с инв. № 630/С-46865, общей площадью 47 кв. м, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/6 (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **284 760,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – (**28 476,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826001693 30000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрациии их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Аукцион состоится **28.02.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.02.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,**
**телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.**

УНП 600077220

---

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Мечта в Оплати 3»

**Сведения о рекламной игре:**

Наименование рекламной игры: **«Мечта в Оплати 3».**

Территория проведения: Республика Беларусь.

Период проведения: с 18 марта 2021 г. по 31 января 2022 г.

В рекламной игре приняли участие 87 712 участников.

Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Победителем приза «Изолированное помещение (квартира) с инвентарным номером 500/D-798822613, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Михаила Савицкого, д. 10, общей площадью жилого помещения 29,1 кв. м, общей площадью по СНБ 31,40 кв. м, кол-во комнат – 1 (одна) и денежные средства в размере 13 111,73 белорусского рубля» стал Симанович Александр Александрович.

Победителем приза «Изолированное помещение (квартира) с инвентарным номером 500/D-798816238, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, д. 3В, общей площадью жилого помещения 27,1 кв. м, общей площадью по СНБ 29,3 кв. м, кол-во комнат – 1 (одна) и денежные средства в размере 12 863,24 белорусских рубля» стала Сахарчук Мария Эмировна.

Победителем приза «Изолированное помещение (квартира) с инвентарным номером 500/D-798816245, расположенное по адресу: г. Минск, ул. лейтенанта Кижеватова, д. 3В, общей площадью жилого помещения 27,2 кв. м, общей площадью по СНБ 29,4 кв. м, кол-во комнат – 1 (одна) и денежные средства в размере 12 907,22 белорусского рубля» стал Скумс Александр Эдуардович.

Победителями 15 (пятнадцати) призов «Игровая приставка PS5 Ultra HD Blu-ray disc CFI-1008A и денежные средства в размере 216,51 белорусского рубля» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Вороницкая Марина Геннадьевна | 6 | Кашевский Артем Сергеевич | 11 | Лумянский Андрей Станиславович |
| 2 | Санькова Яна Валерьевна | 7 | Асташонок Яна Николаевна | 12 | Колосовская Елена Александровна |
| 3 | Дуванов Сергей Анатольевич | 8 | Касьян Анатолий Иванович | 13 | Санькова Яна Валерьевна |
| 4 | Игнатович Андрей Леонидович | 9 | Мамчиц Виталий Николаевич | 14 | Колчанов Кирилл Игоревич |
| 5 | Дуванов Сергей Анатольевич | 10 | Магазинщикова Елена Фадеевна | 15 | Никитина Наталья Николаевна |

Победителями 15 (пятнадцати) призов «Электросамокат Xiaomi Mi Electric Scooter 1S EU FBC4019GL и денежные средства в размере 170,34 белорусского рубля» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Тимашов Александр Валерьевич | 6 | Беспалов Виталий Владимирович | 11 | Шванц Алексей Олегович |
| 2 | Ильковец Светлана Александровна | 7 | Левчук Юлия Юрьевна | 12 | Стрельченко Елена Николаевна |
| 3 | Прескурел Алевтина Владимировна | 8 | Силицкий Александр Юрьевич | 13 | Кобринец Сергей Николаевич |
| 4 | Зубок Сергей Васильевич | 9 | Альсевич Валентина Витальевна | 14 | Тарасенко Алексей Александрович |
| 5 | Шадраков Роман Николаевич | 10 | Баран Дмитрий Викторович | 15 | Дудкина Наталья Викторовна |

Победителями 15 (пятнадцати) призов «Умная колонка Yandex Station серый (YNDX-0001S) и денежные средства в размере 35,86 белорусского рубля» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Русак Андрей Андреевич | 6 | Гошко Антон Геннадьевич | 11 | Юрченко Виктор Юрьевич |
| 2 | Ломакина Оксана Леонидовна | 7 | Мельник Евгений Владимирович | 12 | Куль Юрий Владимирович |
| 3 | Орлов Кирилл Александрович | 8 | Агафонов Леонид Петрович | 13 | Горбачевский Константин Анатольевич |
| 4 | Садовская Алла Романовна | 9 | Бернат Александр Игоревич | 14 | Каратеев Александр Владимирович |
| 5 | Ковалёв Александр Иванович | 10 | Дулебенец Дмитрий Николаевич | 15 | Пальченко Сергей Петрович |

Победителями 15 (пятнадцати) призов «Активная акустическая система JBL, PARTYBOX1000RU и денежные средства в размере 261,50 белорусского рубля» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Новиков Андрей Станиславович | 6 | Разумеев Руслан Анатольевич | 11 | Юров Виталий Владимирович |
| 2 | Федосевич Евгений Витальевич | 7 | Шелкова Евгения Михайловна | 12 | Галиев Сергей Раффакович |
| 3 | Полыко Зоя Николаевна | 8 | Гузова Евгения Александровна | 13 | Широких Татьяна Борисовна |
| 4 | Заверуго Владимир Ярославович | 9 | Черняк Татьяна Анатольевна | 14 | Матюх Сергей Александрович |
| 5 | Каменец Алексей Леонидович | 10 | Колосовская Елена Александровна | 15 | Максимук Николай Васильевич |

Организатором рекламной игры является ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18Б, 2-й этаж, пом. 5, УНП 190771520.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3953 от 12.03.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (29) 343 00 71 в будние дни с 10.00 до 18.00, а также с 12.00 до 14.00 в субботу, сайт o-plati.by.

Правила проведения рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 50 от 18.03.2021.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
27 СТУДЗЕНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 2 (15925)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Аляксандр СІТНІК:

# «Каскадзёр павінен быць акцёрам»



**Свет кінаіндустрыі поўны таленавітых людзей. Аднак твары прадстаўнікоў менавіта гэтай прафесіі часта застаюцца за кадрам, хоць у большасці выпадкаў менавіта яны з'яўляюцца галоўнымі героямі здымачнага працэсу. Гаворка ідзе аб каскадзёрах. Больш падрабязна пра тое, што гэта за прафесія, як у яе прыйсці і з якімі цяжкасцямі даводзіцца сутыкацца падчас здымак, нам расказаў каскадзёр і кіраўнік каманды Аляксандр Сітнік.**

***— Як вы прыйшлі ў гэтую сферу?***

— Мяне заўсёды цягнула да спорту, і ўжо з дзяцінства я хацеў сабе «мужчынскую» прафесію. У свой час займаўся тхэквандо і нават атрымаў званне кандыдата ў майстры спорту па гэтым відзе баявога мастацтва. Пазней адслужыў у арміі ў разведцы, і гэта ўмацавала маё імкненне да «адважнай» прафесіі. Таму пасля войска ўладкаваўся ў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях ратавальнікам. Аднак праца там аказалася не зусім такой, як сабе ўяўляў. На шчасце, у нас мала складаных сітуацый, за паўгода на выклікі выязджаў толькі тры разы, нават выратаваў людзей на пажары. Але душа прасіла большага экстрыму. Якраз у той момант даведаўся, што вядомы каскадзёр Сяргей Васільевіч Катаржэнка набірае да сябе ў каманду каскадзёраў, і вырашыў паспрабаваць туды трапіць. Мяне ўзялі, і праз пару трэніровак я зразумеў, што знайшоў той занятак, які прыносіць задавальненне. Звольніўся з работы і цалкам прысвяціў сябе гэтай справе.

***— Ці складана было ў першыя часы?***

— Насамрэч не. Мне вельмі дапамагло маё спартыўнае мінулае, як і работа ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. Да таго ж трэнер — сапраўдны прафесіянал сваёй справы. Ён прызнаны расійскай Асацыяцыяй каскадзёраў і нават занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса за скачок з вышыні семдзесят два метры. Я хутка ўліўся ў каскадзёрскую справу і зараз не ўяўляю свайго жыцця без гэтага.

***— Як паставіліся да такой незвычайнай прафесіі вашы родныя?***

— Спачатку ўспрымалі са здзіўленнем і падазрона, не ўсе верылі, што ў мяне нешта атрымаецца. Аргументавалі тым, што ў нас усё ж не Галівуд. Многія адгаворвалі, але я нікога не слухаў і змог дабіцца ў новай сферы пэўных вышынь.

***— Як сталі пастаноўшчыкам трукаў?***

— Гэта быў 2017 год, калі не памыляюся. Са сваім кіраўніком мусіў ехаць у Крым, але не атрымалася, і я застаўся ў Беларусі. На той момант ужо зразумеў, што каскадзёрства кідаць не хачу, таму вырашыў стварыць сваю каманду. Набраў хлопцаў, і цэлы год мы проста трэніраваліся. Шмат часу спатрэбілася на тое, каб растлумачыць, што каскадзёр — гэта не пра баявыя мастацтвы, тут хутчэй сцэнічная і тэатральная дзейнасць. І што калі ад вас патрабуецца паказаць бойку, то не трэба гэта рабіць у поўную сілу да прычынення свайму партнёру траўмаў. Калі я зразумеў, што хлопцы атрымалі патрэбную базу, пачалі прымаць удзел у рэкламах. А зараз нашы каскадзёры запатрабаваныя і здымаюцца ў розных фільмах, у тым ліку і замежных.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

Кропка адліку

# ПЕРШЫ ДАРОСЛЫ ВЫБАР

## Чаму не варта аддаваць «руль» іншаму чалавеку?

**Падлеткавы ўзрост — перыяд самаідэнтыфікацыі, калі пытанне «Хто я?» становіцца для чалавека цэнтральным. Старшакласнікі шукаюць сябе і сферу, дзе змогуць найбольш поўна самарэалізавацца. Але далёка не кожны выпускнік школы можа цвёрда сказаць, дзе хоча навучацца і якой бачыць сваю будучыню.**

**Даволі часта прафесію і навучальную ўстанову выбіраюць, зыходзячы з прэстыжнасці, за кампанію з сябрамі або пад уплывам бацькоў. Але, калі задумацца, тут няма нічога дзіўнага: у 17-18 гадоў, маючы за спінай толькі школьны досвед, вельмі складана адважыцца на сур'ёзны выбар. Падлетак слаба ўяўляе, чым займаецца лагіст або SEO-спецыяліст і чым адрозніваецца інжынер-канструктар ад інжынера-выпрабавальніка.**



### Навучыцца разумець сябе

Ёсць меркаванне, што, калі выпускнік не вызначыўся з прызваннем, яму трэба даць час, каб разабрацца ў сабе. Напрыклад, у Еўропе і ЗША шырока распаўсюджана практыка Gap Year — год пасля школы выпускнік знаходзіцца ў пошуку будучай кар'еры, праходзіць навучанне на спецыялізаваных кароткіх курсах і стажыруецца, паглыбляецца ў прафесійнае асяроддзе, каб зрабіць усвядомлены выбар. Там не лічыцца ганебным не паступіць вучыцца адразу пасля школы. Больш за тое, у некаторых краінах вышэйшая адукацыя не значыцца абавязковай для дасягнення сацыяльнага поспеху, і толькі 10 працэнтаў паступаюць ва ўніверсітэты. Затое там не сустрэнеш касіра ў «Макдональдсе» з дыпломам юрыста.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

У свеце трэндаў

# Знайсці ў кожнай разыначку,

## або Калі стыль і шчасце ідуць побач

**Здаецца, большасць з нас хоча выглядаць так, каб ім казалі «вау», да таго ж падабацца не толькі іншым, але і самім сабе на сто працэнтаў. Персанальная стылістка Лілія РЫХТЭР дапамагае з гэтым усім ахвотным: вучыць любіць сябе і падкрэсліваць уласную ўнікальнасць. Аб тым, як зрабіць апошняе, чаму важна ведаць асабісты тыпаж знешнасці і чым дапамагае разбор гардэробу, мы запыталіся ў спецыяліста.**



Лілія па адукацыі менеджар-эканаміст, закончыла Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Менеджмент», аднак у пэўны момант зразумела, што яе прызванне ў іншым.

— Адразу пасля вучобы я паехала ў родны Лунінец, працаўладкавалася ў райвыканкам. Паралельна займалася нарошчваннем веек, такое хобі з'явілася яшчэ ў студэнцтве, тады гэта таксама было папулярна. Да таго ж хадзіла на шопінг з сяброўкамі і любіла збіраць вобразы для сябе. Пасля дадалася работа з прычоскамі і макіяжам. Адкрыла свой бьюці-кабінет, можна сказаць, стала вядомай у горадзе. Занятак прыносіў грошы і быў па душы: дзяўчаты, якія прыходзілі да мяне, змяняліся і сыходзілі шчаслівыя. Праз некаторы час вырашыла, што хачу зарабляць толькі бьюці-паслугамі, і звольнілася. Аднак прайшло пару гадоў, і раптам адчула, што больш не развіваюся, пачаўся так званы творчы крызіс: нічога не натхняла, унутры была пустэча. Тады і прыйшла думка аб стылі. Нядоўга разважаючы, прайшла навучанне ў сталічнай анлайн-школе і з тых часоў працую менавіта ў гэтым кірунку.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***

*Абітурыент–2022*

# СПЕЦЫЯЛІСТЫ ДЛЯ «РАЗУМНАГА ГОРАДА» І «ЗЯЛЁНАЙ ЭКАНОМІКІ»

**Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна адкрывае набор на новую спецыяльнасць — «Урбаналогія і сіці-менеджмент».**

Першы набор складзе 20 студэнтаў: сямнаццаць з іх будуць навучацца за бюджэтны сродкі, а трое — на платнай форме навучання. Для паступлення трэба будзе здаць тры экзамены ў форме ЦТ: геаграфію, матэматыку і беларускую (рускую) мову. Працягласць навучання складзе чатыры гады. Выпускнікі новай спецыяльнасці атрымаюць дыплом аб вышэйшай адукацыі з кваліфікацыяй «Урбанолаг. Менеджар». Рыхтаваць спецыялістаў будуць на кафедры геаграфіі і прыродакарыстання факультэта прыродазнаўства.

«Урбаналогія і сіці-менеджмент» — новая для рынку працы нашай краіны спецыяльнасць. Неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай галіне прадыктавана патрэбай у комплексным вырашэнні праблем урбанізацыі. Адукацыйная праграма пабудавана на сучасных сусветных падыходах да кіравання гарадскім развіццём і дасць магчымасць сфарміраваць унікальных спецыялістаў па напрамках «Гарадскі дызайн», «Гарадское планаванне і кіраванне».

Місія ўрбанолага заключаецца ў тым, каб любы населены пункт (у першую чаргу горад) зрабіць зручным для жыцця людзей, забяспечыўшы пры гэтым яго ўстойлівае развіццё. Спецыялісты ў галіне ўрбаналогіі могуць адыграць ключавую ролю ў рэалізацыі канцэпцыі «разумны горад», а таксама па развіцці ў краіне «зялёнай эканомікі».

Выпускнікі гэтай спецыяльнасці змогуць працаваць як у дзяржаўных арганізацыях і ўстановах, так і ў прыватным сектары, паспяхова будаваць кар'еру ў адміністрацыях гарадоў і раёнаў, сферах архітэктуры і горадабудаўніцтва, транспарту і лагістыкі, экалогіі і ландшафтнага праектавання, у гандлі і грамадскім харчаванні. Атрыманыя кампетэнцыі дадуць магчымасць ім прафесійна рэалізоўвацца на дзяржаўнай службе, у камерцыйных і некамерцыйных арганізацыях нацыянальнага і міжнароднага ўзроўню, арганізоўваць уласны бізнес.

*Твой шанц*

# ЗАЯВІЦЬ ПРА СЯБЕ Ў ГАЛІНЕ ЯКАСЦІ

## Рэспубліканская алімпіяда па менеджменце стартавала ў Беларусі

**Прыняць удзел у ёй могуць студэнты і магістранты ВНУ, а таксама спецыялісты ва ўзросце да 30 гадоў, чыя прафесія звязана з якасцю прадукцыі і паслуг.**

Алімпіяда праходзіць у два этапы. На першым (да 1 сакавіка) індывідуальныя ўдзельнікі і каманды накіроўваюць свае заяўкі, рэфераты і прэзентацыі, падрыхтаваныя на аснове рэфератаў, ва ўстановы вышэйшай адукацыі (калі яны з'яўляюцца студэнтамі, магістрантамі) або ў сакратарыят Рэспубліканскай экспертнай камісіі (калі з'яўляюцца спецыялістамі ў галіне якасці). Экспертная камісія дзейнічае на базе Дзяржстандарта і БелДІС. Для рэферата можна выкарыстоўваць адну з прапанаваных тэм («Стандарты для дасягнення Мэт устойлівага развіцця», «Менеджмент інфармацыйнай бяспекі», «Разумная ўпакоўка...», «Зялёныя тэхналогіі...» і інш.) або ўласную. У апошнім выпадку работа павінна адлюстроўваць пытанні, звязаныя з прымяненнем практык і метадаў менеджменту.

ВНУ і сакратарыят Рэспубліканскай экспертнай камісіі абяруць найлепшыя работы і вызначаць фіналістаў. На другім этапе ўдзельнікаў чакаюць тэсціраванне і паказальныя камандныя выступленні. Пераможцы, якія набяруць найбольшую колькасць балаў, будуць узнагароджаны дыпломамі I, II і III ступені. Таксама яны атрымаюць права на публікацыю работы ў выглядзе навуковага артыкула ў выданнях Дзяржстандарта.

# ПЕРШЫ ДАРОСЛЫ ВЫБАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Расійскія і міжнародныя даследаванні сведчаць, што на адукацыйныя амбіцыі школьнікаў уплывае не столькі іх паспяховасць, колькі сацыяльна-эканамічны статус сям'і, які адбіваецца на ўспрыманні асабістай «планкі» і гарызонту перспектыў. Самая распаўсюджаная памылка — не задаць сабе пытанне «Навошта?» перад тым, як інвеставаць велізарную колькасць свайго часу, а часцяком і грошай, каб атрымаць запаветную «адтэрміноўку ад дарослага жыцця» яшчэ на чатыры гады.

Самая правільная стратэгія для бацькоў — не ціснуць на дзіця, не прымушаць прыняць свой пункт гледжання, а даць магчымасць зрабіць выбар самастойна. Самая ж правільная стратэгія для падлетка — спрабаваць як мага больш нявага, рознага і навучыцца разумець сябе і свае жаданні.

> **«Сапраўдная вышэйшая адукацыя мае на ўвазе асаблівы склад розуму».**

У прафарыентолагаў ёсць тэрмін «шчылінная прафарыентацыя» — так яны характарызуюць сітуацыю, калі бацькі не бачаць разнастайнасці прафесійных магчымасцяў і падштурхоўваюць дзіця толькі ў адным кірунку, накшталт «я быў стаматолагам — і ты ім будзеш». А ў школьнікаў гарызонт планавання ўвогуле самы недалёкі: для іх нейкая там работа праз чатыры-пяць гадоў пасля заканчэння ўніверсітэта — гэта штосьці вельмі і вельмі далёкае і абстрактнае, амаль перадпенсійны ўзрост.

## «Цалаваць, дык каралеву...»

— Я заўсёды прашу прыйсці на кансультацыю разам з бацькамі, таму што выбар прафесіі — гэта перадача «руля» кіравання сваім жыццём у сістэме ўзаемаадносін «бацькі — дзіця». І кажу ім: «З гэтага моманту вы становіцеся для свайго дзіцяці навігатарам, яго фан-клубам, групай падтрымкі. Але выбар прафесіі — гэта менавіта той выпадак, калі самы час адысці ўбок і даць магчымасць вызначыцца», — кажа **прафарыентацыйны псіхолаг Ганна ІСАЕНКА.** — А я падчас кансультацыі бяру на сябе ролю «інструктара па ваджэнні», расказваю пра ўсе магчымасці і варыянты і дапамагаю прыняць правільнае рашэнне... Падлеткі як разважаюць? Цалаваць — дык каралеву, зарабляць — дык мільён! Калі працаваць — то толькі прэзідэнтам, калі не краіны — то буйной кампаніі. Калі раўняцца, дык на Ілана Маска. І я заўсёды прашу педагогаў: не размаўляйце з дзецьмі з пазіцый здаровага сэнсу! Не трэба зазямляць іх фразамі тыпу: «Куды ты нацэліўся? Там цябе ніхто не чакае!» Падлетак проста павінен верыць у тое, што ён стане прэзідэнтам, генералам, паспяховым бізнесменам або высокааплатным спецыялістам...

Традыцыйнай пры выбары прафесіі з'яўляецца формула на скрыжаванні сфер «ХАЧУ—МАГУ—ТРЭБА». З запатрабаванасцю прафесій разабрацца даволі лёгка: адкрылі любы сайт па пошуку работы і прагледзелі вакансіі і ўмовы аплаты.

З тым, што «ХАЧУ», ужо крыху больш складана. Гэта адзін з самых частых запытаў: «Не ведаю, чаго хачу». Пры гэтым старшакласнікі, як правіла, нядрэнна арыентуюцца ў тым, чаго дакладна не жадаюць. І гэта ўжо добра. Ёсць ад чаго адштурхнуцца і сфарміраваць сацыяльныя чаканні ад будучай прафесіі. Але галоўная работа на кансультацыі ідзе з тым, што малады чалавек можа. І гэта нават не столькі адзнакі ў яго школьным дзённіку і перамогі на алімпіядах ці канферэнцыях (хоць і гэта таксама важна)... А тое, да чаго душа ляжыць, на што чалавек «заліпае», куды яго вабіць часта апроч уласнай волі і насуперак бацькоўскім забаронам. Мая задача — выявіць патэнцыйную адоранасць. Дзе чалавек праяўляе звышактыўнасць, куды ён інвестуе свой час пры першым жа зручным выпадку? Бо там яго эмацыянальны рэсурс, яго энергетыка. Я наўмысна не ўжываю словазлучэнне «марнуе час». Ён менавіта «інвестуе», сам таго не ведаючы, развівае, «прапампоўвае» сваю патэнцыйную адоранасць...

## Вышэйшая адукацыя — раскоша?

Ёсць два погляды на перспектыўныя прафесіі — з умоўнага «цяпер» і з «будучыні». У першым выпадку перспектыўная прафесія выступае сінонімам запатрабаванай на рынку працы цяпер. Але што будзе запатрабавана ў будучыні? Скажам, праз 10—15 гадоў? Такія прагнозы пастаянна змяняюцца. Па ацэнцы Сусветнага эканамічнага форуму, попыт будзе расці на аналітыкаў даных, спецыялістаў па машынным навучанні, IT-распрацоўшчыкаў, спецыялістаў па кібербяспецы, прафесіяналаў па развіцці бізнесу.

Агульнасусветная тэндэнцыя на рынках працы і адукацыі такая, што чалавек не выбірае прафесію і адукацыю раз і назаўжды. Гэта толькі першы яго выбар, таму зрабіць яго становіцца крыху прасцей. Але заўсёды трэба мець на ўвазе, што фундаментальную адукацыю (медыцынскую ці інжынерную) цяжка ці амаль немагчыма атрымаць другой. Яны занадта энергазатратныя для атрымання. Таму, калі вы выбіраеце паміж некалькімі спецыяльнасцямі, лепш пачаць з фундаментальнай.

Ёсць меркаванне, што вышэйшая адукацыя — гэта раскоша, бо яна не патрабуецца нам для выжывання. З развіццём тэхнічных магчымасцяў не ўсе падлеткі бачаць сэнс вучыцца ў ВНУ чатыры-пяць гадоў: зарабіць грошы анлайн яны змогуць і без гэтага. Многія прасоўваюць свае блогі, акаўнты ў Instagram і іншых сацсетках і зарабляюць немалыя грошы на рэкламе.

Але трэба разумець, што сапраўдная вышэйшая адукацыя мае на ўвазе асаблівы склад розуму: гэта здольнасць чалавека працаваць з вялікімі аб'ёмамі інфармацыі, структураваць яе, што вельмі каштоўна, уменне самастойна эфектыўна вучыцца, гэта кола ўзаемаадносін і дзелавыя сувязі, якія застаюцца з вамі на ўсё жыццё.

Магчыма, у нейкай недалёкай будучыні мы будзем успрымаць універсітэт выключна як ступень для асобаснага развіцця і фарміравання канцэптуальнага погляду на свет, а не як месца для атрымання прафесіі, асабліва з улікам таго, што за жыццё нам давядзецца змяніць пяць—восем прафесій. Адукацыя становіцца ўсё больш падобнай на «канструктар» з ведаў, які чалавек можа перасабраць самастойна. У найбліжэйшай будучыні людзі пачнуць адукоўваць сябе самі, рэальна ўсведамляючы, якія менавіта веды ім патрэбныя, а адукацыя стане бесперапынным працэсам.

## Мяккія навыкі

Пакуль мы ўсе думаем, што ёсць IT-кампаніі і ўсе астатнія, свет вакол нас змяняецца. І сёння трэба вучыцца спалучаць тэхнічныя навыкі накшталт матэматычных і камп'ютарных навук, паняційнае і сістэмнае мысленне, аналіз, сінтэз, алгарытмізацыю, логіку плюс дадаць да іх сацыяльныя і асобасныя навыкі, эмацыянальны інтэлект, здольнасць да камунікацыі, інтуіцыю, майстэрства весці перагаворы і абменьвацца думкамі.

А ўвогуле ТОП-навыкаў, насамрэч важных для работадаўцаў на сёння, выглядае наступным чынам: на першым месцы стаіць уменне вырашаць праблемы, здольнасць працаваць у камандзе, эфектыўная камунікацыя, лідарства, рабочая этыка, аналітычныя здольнасці і ініцыятыўнасць, увага да дэталяў, гнуткасць і адаптыўнасць. Пад увагу бяруцца і такія якасці, як крэатыўнасць, таварыскасць, арганізатарскія здольнасці... Так званыя мяккія навыкі (soft skills) пачынаюць «важыць» намнога больш, чым тэхнічныя.

> **«Сацыяльна-эканамічны статус сям'і адбіваецца на ўспрыманні асабістай «планкі» і гарызонту перспектыў».**

Заўважана, што добрымі спецыялістамі становяцца часта выдатнікі-перфекцыяністы: яны пастаянна самаўдасканальваюцца, таму і дасягаюць высокіх вынікаў. Але для таго, каб працаваць кіруючым менеджарам, зусім неабавязкова мець добрыя акадэмічныя здольнасці — больш важна, каб чалавек быў камунікабельны. Здольнасць маніпуляваць іншымі людзьмі таксама можа спатрэбіцца. А для адкрыцця сваёй справы трэба быць ініцыятыўным і смелым. Між іншым, ініцыятыўнасць, прадпрымальніцкая жылка і здольнасць зарабляць грошы зусім не карэлююць з акадэмічнай адоранасцю.

Увогуле, ёсць розныя віды адоранасці: акадэмічная, мастацкая, практычная, духоўная, камунікатыўная, эмацыянальная, міжасобасная... Таму трэба да сябе прыслухацца, разабрацца ў асабістых якасцях, вывучыць свае схільнасці, здольнасці, улічваць асаблівасці памяці, увагі, мыслення, тэмпераменту. Да таго ж адоранасць забяспечвае магчымасці, а зусім не гарантыю больш высокіх дасягненняў. Ці зможаш ты імі правільна распарадзіцца, залежыць толькі ад цябе... Вось што КАТЭГАРЫЧНА не трэба рабіць — гэта перадаваць руль кіравання сваім жыццём іншым: бацькам, сябрам, настаўнікам. А ахвотных яго ўзяць заўсёды знойдзецца дастаткова...

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Не вучобай адзінай*

# НАТХНЯЦЬ НА НОВЫЯ АДКРЫЦЦІ

## У студэнтаў БДУ з'явіўся талісман

**Гэта двухметровая роставая лялька-бабёр у касцюме карпаратыўнага сіняга колеру. Над стварэннем талісмана працавалі чацвёртакурснік Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута імя Сахарава БДУ Аляксандр Хаміцэвіч, другакурсніца эканамічнага факультэта Анастасія Жабрун і педагог-арганізатар Студэнцкага гарадка Вольга Рабчынская.**

Выява бабра выбрана невыпадкова. Па словах аўтараў, важна было знайсці дакладны сімвал, які адлюстроўвае старannасць і працавітасць студэнтаў БДУ, а таксама думку аб тым, што ўсяго можна дасягнуць дзякуючы ўласным намаганням.


Фота прэс-службы БДУ.

Гісторыя з'яўлення талісмана звязана з легендай, паводле якой трэцякурснік БДУ сустрэў дапытлівае бабраня, якое марыць пабываць у космасе. Студэнт узяў звярка ва ўніверсітэт, пазнаёміў яго з таварышамі і выкладчыкамі, расказаў пра дасягненні ВНУ. Бабраня ўбачыла, як веды і ўменні дапамагаюць увасабляць у жыццё самыя смелыя мары. Яно вырашыла застацца, каб прыносіць супрацоўнікам і студэнтам поспех, натхняць іх на новыя адкрыцці, узнімаць настрой і быць спадарожнікам на працягу ўсяго іх студэнцкага шляху.

З гэтага часу роставая лялька-талісман стане галоўным героем маладзёжных свят БДУ і будзе падтрымліваць універсітэт на ўсіх значных рэспубліканскіх і гарадскіх мерапрыемствах.

Конкурс на распрацоўку сімвала студэнцтва БДУ праходзіў у жніўні-верасні 2021 года і быў прымеркаваны да 100-годдзя ВНУ. Усяго было разгледжана 20 варыянтаў талісмана ад студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*У ліку найлепшых*

# Каралева — наша!


Фота з сайта БРСМ.

**Тытул «Каралева студэнцтва Саюзнай дзяржавы — 2021» заваявала студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Вікторыя Вараб'ёва. Фінал юбілейнага 30-га расійска-беларускага конкурсу прыгажосці і творчасці прайшоў у Стаўрапалі.**

У склад удзельніц конкурсу ўвайшлі 12 пераможцаў нацыянальных этапаў конкурсу Беларусі і Расіі. Нашу краіну прадстаўлялі чатыры ўдзельніцы: «Каралева студэнцтва Беларусі 2021» студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Валерыя Фомчанка, «Віцэ-Каралева студэнцтва Беларусі 2021» студэнтка ВДТУ Вікторыя Вараб'ёва, «Каралева творчасці Беларусі» студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Карына Саргавіцкая, «Каралева студэнцтва Натхнення Беларусі» студэнтка Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» Арына Кулік.

Фіналісткі пазмагаліся ў прамоўніцкім, інтэлектуальным, творчым конкурсах, дэфіле ў вясельных сукенках, нацыянальных гарнітурах і вячэрніх уборах.

Арганізатарамі конкурсу выступаюць Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Расійскі саюз моладзі. У 2022 годзе конкурс праходзіць пры падтрымцы ўрада Стаўрапальскага краю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Знайсці ў кожнай разыначку...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Лілія ўпэўнена, што яе прыход у сферу стылю — вынік самаразвіцця і перамен, пачатак унутранага росту. Менавіта ў гэты перыяд наша гераіня стала больш прыслухоўвацца да сябе. Большая частка дзейнасці суразмоўніцы зараз — анлайн-кансультацыі, афлайн-шопінг, разбор гардэробу.

— Я працую праз сістэму тыпажоў знешнасці — гэта мой інструмент дапамогі жанчынам. Калі адзенне будзе адпавядаць вашаму тыпу фігуры, рысам твару і іншаму, вы будзеце выглядаць гарманічна і прыгожа як знешне, так і ўнутрана. Сістэма складаецца з чатырох частак — гамін, рамантык, натурал і драматык. Першая група ў перакладзе з французскай азначае «стройная, элегантная дзяўчынка». Таму мы адразу можам прывесці асацыяцыю. Гэта, як правіла, невысокія дзяўчаты з вялікімі вачыма, маленькімі вуснамі, мініяцюрнай фігурай. Другая катэгорыя — рамантыкі, для іх характэрная жаноцкасць і пачуццёвасць. У прычосках заўсёды павінны прысутнічаць мяккія плаўныя лініі, незалежна ад даўжыні валасоў і ўкладкі. Гэта дзяўчаты з «лялечнымі» вачыма, акуратнымі вуснамі, вузкімі плячамі, але шырокімі сцёгнамі. Ім важна падкрэсліваць талію, прымяняць у адзенні мяккія колеры, выкарыстоўваць лёгкія фактуры і тканіны. Наступны тыпаж — натуралы. У іх шырокія тvары і бровы, прамыя доўгія стройныя ногі. Можна сказаць, што гэта эталонны вобраз жанчыны, які часцей за ўсё транслюецца на шырокую аўдыторыю. Для іх у адзенні важна падкрэсліваць натуральнасць і лёгкасць. І апошні тыпаж — драматыкі. Гэта высокія дзяўчыны з доўгімі рукамі і нагамі, у іх тонкія вусны, часта доўгія насы, прамыя бровы, усюды прамыя лініі. На іх вельмі часта звяртаюць увагу, і яны самі любяць знаходзіцца ў цэнтры падзей. Ім варта выкарыстоўваць вертыкальныя лініі, быць выразнымі і яркімі. Але трэба сказаць, што чыстыя тыпажы сустракаюцца вельмі рэдка, таму пры складанні гардэробу ўлічваюцца розныя індывідуальныя моманты.

Лілія падкрэслівае, што важна звяртаць увагу не толькі на тып фігуры, знешнасць, але і на вобраз жыцця, мэты. Напрыклад, калі вы актыўная мама, то ў гардэробе павінна прысутнічаць больш зручнае адзенне, прасторнае, у стылі кэжуал. Калі вы займаеце кіраўнічую пасаду, стыль павінен быць іншы.

— Памятайце: як толькі мы яго мяняем, гэта абавязкова прыводзіць да змяненняў у жыцці. Ёсць нават такі выраз: 70 працэнтаў думак пра нас складваецца з таго, як мы выглядаем, 20 працэнтаў — як мы кажам, і толькі 10 — ад таго, што мы гаворым. Таму карыстайцеся вашым знешнім выглядам. Рэчы павінны вам служыць, вас упрыгожваць. Ёсць пэўны спіс таго, на што варта звярнуць увагу і лепш мець у сваім гардэробе. Гаворка ў першую чаргу аб базавым: гэта рэчы простага, зразумелага крою, з мінімальным дэкорам, якія складана аднесці да якога-небудзь пэўнага стылю. Своеасаблівы ліст паперы, на якім вы будзеце маляваць свой настрой. Існуюць розныя спісы такіх рэчаў, я прапаную мець прамыя сінія джынсы, класічныя штаны, белыя кеды, актуальны пінжак добрага крою, джэмпер або кашулю, белую футболку, якасны рэмень і сумку, паліто ніжэй калена, трэнч. А далей да гэтых рэчаў можна дадаваць іншыя, больш выразныя.

Што значыць быць стыльным і як знайсці свой стыль? — пытанне, якім задаюцца многія дзяўчаты...

— На яго фарміраванне ўплываюць розныя фактары: наш лад жыцця, мэты, асаблівасці фігуры і знешнасці (тыпаж і каларыт), нават смакавыя схільнасці. Аднак ёсць нейкія рэчы, якія ў нас перыядычна дублююцца. Напрыклад, адна і тая ж прычоска або дэталь у вобразе накшталт брошкі ці завушніц. Дык вось важна знайсці гэтую разыначку, каб вас запомнілі, каб хтосьці, прыгадваючы вас, дакладна прадстаўляў ваш вобраз і асаблівасці стылю. Напрыклад, калі мы кажам аб Рэнаце Літвінавай, у галаве адразу ўсплывае пэўны вобраз: вытанчанасць, рэтра-шык... А ў чым ваша індывідуальнасць?

Суразмоўніца папярэджвае: для таго, каб знайсці свой стыль, трэба вельмі шмат часу.

— Спачатку спытайце сябе: якая я? Тое, як выглядаю, ці адпавядае гэта таму, як сябе адчуваю? Ці падабаюся сабе? Наколькі добра сябе ведаю? У чым мне зручна? Знешнасць непарыўна звязана з нашым унутраным светам. Як зразумець, што тая ці іншая рэч або вобраз сапраўды падабаюцца, а не навязаны нам рэкламай, трэндамі і іншымі рэкамендацыямі тыпу «так трэба»? Падумайце, якія інтэр'еры вас прыцягваюць, якія карцінкі чапляюць вашу ўвагу, з якіх ліній яны складаюцца, у якім стылі выкананы, якія каляровыя спалучэнні сустракаюцца часцей за ўсё. Ежа, музыка, фільмы — усё гэта ёсць вы. Шмат хто з нас не ведае, чаго мы хочам. Для таго, каб з гэтым было прасцей, я раю стварыць папку ў Pinterest і сабраць там карцінкі, якія натхняюць. Не толькі модныя вобразы, але і прадметы архітэктуры і іншае. А потым прааналізаваць іх — якія колеры, лініі, формы прываблівае для вас, ці багата дэталяў або, наадварот, які характар і настрой перадаюць гэтыя выявы. Яны павінны быць звязаны з тым, як вы сябе адчуваеце ў дадзены момант, які вобраз жыцця вядзяце, у якой краіне жывяце. Магчыма, у папцы ёсць нейкія рэчы, абутак, прычоска, якія падабаюцца больш за ўсё. Трэба іх запомніць і ўжо падчас шопінгу звяртаць больш увагі.

> **«Я працую праз сістэму тыпажоў знешнасці — гэта мой інструмент дапамогі жанчынам».**

Зараз у трэндзе мінімалізм, лаканічнасць формаў, сілуэтаў, зручнасць і камфорт, адзначае Лілія.

— Звярніце ўвагу на паліто-кашулю ў буйную клетку, акцэнтныя колеры накшталт ліловага, балотнага, сіняга. Да таго ж для многіх актуальнае пытанне «як выглядаць стыльна, маючы невялікі бюджэт». Лепш за ўсё выбіраць лаканічныя вобразы, тыя, дзе больш натуральныя колеры, якія выглядаюць высакародна, каб іх можна было паміж сабою міксаваць. Калі стаіць выбар паміж адной дарагой рэччу і некалькімі таннымі, калі гэта базавая рэч, якая павінна вам праслужыць доўга, бо дакладна не выйдзе з моды некалькі, а то і больш сезонаў, дык аддавайце перавагу першаму варыянту. А калі хочацца прымераць на сябе нейкі «гарачы трэнд», то няма сэнсу пераплачваць за тое, што можа састарэць у наступным сезоне.

— А што наконт разбору гардэробу? — пытаюся ў Ліліі. — Зараз гэта таксама вельмі папулярна, асабліва падчас пандэміі.

— Безумоўна, такі працэс важны, яго пажадана рабіць мінімум раз у паўгода. Пачатак новага сезона — удалы час. Магу параўнаць гэта з абнаўленнем жыцця. Многія маюць звычку назапашваць шмат непатрэбных рэчаў «на потым», а яно ніколі не надыходзіць. Таму трэба вучыцца расставацца са старымі рэчамі, якія ўжо не функцыянальныя, з састарэлым кроем, не падыходзяць вашаму ўнутранаму стану. Таксама гэта трэба рабіць для таго, каб убачыць, чаго вам не хапае ў сваім гардэробе. Як правільна арганізаваць яго разбор?



Дастаём з шафы ўсе рэчы і складваем па групах: спадніцы са спадніцамі, джынсы з джынсамі і гэтак далей. Пасля аналізуем кожную па наступных пунктах: наколькі адзенне падыходзіць вам па колеры, фасоне, наколькі зношанае, ці ўвогуле падабаецца, ці адпавядае пажаданай стылістыцы і вобразу жыцця. Так фарміруецца базавы гардэроб. Ён — аснова. Гэта павінны быць неакцэнтныя рэчы, бо з іх не пабудуеш шмат спалучэнняў адзення. Далей складаеце спіс пакупак. Калі не хапае базавых рэчаў, то спачатку ўносім у шопінг-ліст менавіта іх. Калі іх шмат, то падумайце, якія акцэнтныя рэчы жадаеце набыць. Спытайце, як хочаце сябе выяўляць, што трансліраваць. І ўжо тады адпраўляйцеся ў краму.

Каб схаваць недахопы фігуры і падкрэсліць яе вартасці, трэба ўмець сябе ўдала прыпаднесці, лічыць Лілія.

— Па-першае, аб'ектыўна ацаніце сябе. Зрабіце замеры і вызначце, дзе ў вас канцэнтруюцца аб'ёмы. Потым выбераце, што хочаце карэкціраваць. Самыя частыя праблемныя зоны — шырыня плячэй, жывот, аб'ём сцёгнаў, грудзей, даўжыня ног. З гэтага спіса вылучыце два-тры моманты, якія патрабуюць візуальнай карэкцыі. Каб схаваць недахопы з дапамогай адзення, можна выкарыстоўваць чатыры групы інструментаў: вертыкалі і гарызанталі; светлае і цёмнае; прынт, розныя ўпрыгажэнні і ўзоры; абцягванне і вольны сілуэт. Дарэчы, магу сказаць, што з цягам часу запыты і перавагі дзяўчат наконт вызначэння стылю кардынальна змяніліся. Калі раней многія хацелі чагосьці новага, незвычайнага, то цяпер амаль усім важна, каб было зручна, функцыянальна, з мінімальным наборам рэчаў, але каб яны паміж сабой спалучаліся і, вядома ж, каб гэта было прыгожа і гарманічна.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

SEX-БАЛЯСЫ

# ПераВАГІ палоў

**Згодна з вынікамі леташняга апытання на адным з сайтаў знаёмстваў, мужчыны з пузікам аказаліся самымі прыцягальнымі для прыгожай паловы чалавецтва. («Мая лішняя вага паказвае, як многа жанчын шукала шлях да майго сэрца».) Тлумачэнне было простае: адзінокія людзі пачынаюць лічыць прывабнымі ўсё больш разнастайныя тыпы фігур, паколькі ведаюць, як цяжка трымаць сябе ў форме падчас пандэміі. («Падыходжу да люстэрка — трэба пахудзець. Падыходжу да халадзільніка — трэба пажэрці... Ва ўсім вінаватыя ногі».) Ці справа толькі ў апошняй? Калі верыць даследаванню, праведзенаму Універсітэтам Эрсіес у Кайсеры (Турцыя), целасклад мужчыны кажа аб яго навыках спакушэння больш, чым мы меркавалі раней. («Тыя, хто кахае худзенькіх, памятайце: змеі тоўстымі не бываюць».) Аказалася, што найлепшыя палюбоўнікі — поўныя прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва. («Мужчыны, калі ў вас павялічылася залысіна і расце жывот, не адчайвайцеся. Проста лічыце, што з адважнага рымскага палкаводца вы пераўтвараецеся ў заможнага рымскага сенатара».)**

Такія кавалеры, у адрозненне ад «качкоў», дэманстравалі большую цягавітасць падчас заняткаў каханнем. («— О, прыйшлі мае любімыя 50 кілаграмаў!» — «Насамрэч 58». — «Ну, значыць, я нешта ў табе недалюбліваю».) Калі паглыбляцца ў дэталі, то мужчыны з больш высокім індэксам масы цела ў сярэднім актыўныя ў ложку 7,3 хвіліны, у той час як мужчыны са звычайнай ці недастатковай вагой «здзімаюцца» ўжо праз дзве хвіліны. («— Ты якім відам спорту займаешся?» — «Фігурным ляжаннем на канапе».) Даследчыкі назвалі прычыну гэтага, і яна менш сексуальная, чым хацелася б: паколькі ў больш тоўстых мужчын з вялікай колькасцю тлушчу на жываце ўзровень эстрагену — гэта значыць жаночага палавога гармону — павышаны, ім патрабуецца больш часу, каб дасягнуць аргазму, і, такім чынам, заняткі «тым самым» атрымліваюцца даўжэйшыя. («— Ну ты і пуза наеў!» — «У добрага гаспадара конь павінен стаяць пад навесам».) А добра трэніраваныя мужчыны, якія рэгулярна наведваюць спартыўную залу, маюць ніжэйшы ўзровень эстрагену, таму для дасягнення аргазму ім патрабуецца менш часу. («— Ты спортам займаешся?» — «Секс залічваецца?» — «Канешне». — «Тады не».)



Даследаванне таксама зрабіла яшчэ адно нечаканае адкрыццё: жанчынам не падабаецца прэс з шасцю кубікамі. 75 працэнтаў апытаных аддаюць перавагу так званаму «татаваму целу», гэта значыць, невялікім жывоцікам. («— Кацярына, за вамі мужчыны бегаюць?» — «Бегаюць, але не вельмі хутка...») Аднак тлумачэнне гэтаму не столькі ў тым, што яны знаходзяць іх больш прывабнымі, а ў тым, што жанчынам прасцей распрануцца перад «недасканалым мужчынам». («Сёння прызналася свайму падбародку, што ён у мяне не першы».) Калі ў партнёра шыкоўнае спартыўнае цела, то жанчына можа адчуваць сябе вельмі няўпэўнена і саромецца найменшага недахопу сваёй фігуры. («Самы лепшы сродак для пахудзення — секс. Але пераканаць у гэтым жанчыну практычна немагчыма, таму амаль усе яны такія тоўстыя».) Гэтак жа ёсць шэраг навуковых абгрунтаванняў, чаму тоўстыя мужчыны прыцягваюць жанчын. Адна з прычын — наш самы асноўны інстынкт. Поўны жывот і сцёгны — ён дастаткова зарабляе, каб шмат і смачна есці, і можа забяспечыць сям'ю і будучыню нашчадкаў, таму можна сказаць, што такі выбар закладзены на падсвядомым узроўні. («— Цікава, як я буду выглядаць, калі мне будзе дзевяноста?» — «Ты такі аптыміст!» — «Чаму аптыміст? Мне да дзевяноста ўсяго пару кілаграмаў засталося».)

З прадстаўніцамі прыгожай паловы чалавецтва, аказваецца, таксама не так усё проста. Навукоўцы распавялі аб карысці залішняй вагі для іх. («Не плач, дзяўчына, ты не тоўстая, проста бацькі цябе спецыяльна клапатліва адкармілі, каб засцерагчы ад стрыптызу і прастытуцыі...») Жанчыны з больш высокім узроўнем тлушчу абаронены ад рызыкі смерці ад сардэчных захворванняў у параўнанні з тымі, у каго яго менш, сцвярджаюць навукоўцы з Каліфарнійскага ўніверсітэта. («Якая я малайчына! Тры салаты, кілаграм пельменяў і нават торцік з гарбатай... І ўсё гэта да шасці паспела з'есці!») Даследчыкі вызначылі, што смяротнасць ад захворванняў сэрца ў жанчын з вялікай мышачнай масай і вялікім утрыманнем тлушчу ў арганізме на 42 працэнты ніжэйшая ў параўнанні з тымі, у каго мышцаў і тлушчу было мала. («Паўтара царства за тоўстую прынцэсу!»)

Больш за тое, жанчын папярэджваюць аб небяспецы дыет. («Малады чалавек, убачыўшы астранамічныя цэны ў рэстаранным меню, спытаў у сваёй дзяўчыны: «Што ты хочаш заказаць, мая таўстушка?») Яны падчас дыеты знаходзяцца ў стрэсавым стане і пасля яе завяршэння зноў набіраюць вагу, паведаміў Нацыянальны цэнтр анкалогіі рэпрадуктыўных органаў Маскоўскага навукова-даследчага анкалагічнага інстытута імя Герцэна. Адзначаецца, што любімыя прадукты можна есці рэгулярна, але ў невялікіх колькасцях. («Сяджу на кухні і спяваю сабе пад нос: «Антошка, Антошка, пажэрці трэба трошкі!» А ўнутраны голас падпявае: «Цілі-цілі, тралі-валі, вы нядаўна ўжо ўмялі!»») Па словах спецыялістаў, гэта самы просты спосаб, пры якім жанчына не адчувае сябе няшчаснай. («— Любы, скажы мне на ноч мае любімыя словы». — «Смачна есці!») Вось такі паварот... («Я тоўстая толькі таму, што ўва мне жывуць адразу некалькі прынцэс».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Каскадзёр павінен быць акцёрам»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Вам больш падабаецца быць пастаноўшчыкам трукаў або самому іх выконваць?***

— Мне, вядома, падабаецца прыдумляць новыя трукі і ставіць ужо існуючыя, але, паколькі дазваляе яшчэ ўзрост, то выконваю іх часта сам. Гэтую справу люблю і буду яе рабіць, пакуль ёсць сілы.

**«Ніякія траўмы не напалохаюць і не прымусяць сапраўднага каскадзёра кінуць гэтую справу».**

***— Якімі якасцямі павінен валодаць чалавек, каб стаць каскадзёрам?***

— Каскадзёр — гэта ўніверсальны спецыяліст, ён павінен быць развіты ў розных абласцях. І я зараз кажу не толькі пра фізічную падрыхтоўку. Майстар спорту міжнароднага класа, напрыклад, па боксе, зусім неабавязкова будзе добрым каскадзёрам. Можа прыйсці хлопец, які ўвогуле спортам не займаўся, але ён развіваецца, займаецца, і ў яго ёсць схільнасці і талент да каскадзёрства. Тады ў яго больш шанцаў дасягнуць вяршынь у гэтай справе. Самому, вядома, дастаткова цяжка зразумець, ці ёсць у цябе задаткі да такога занятку, лепш звярнуцца па прафесійнае меркаванне. Калі казаць, на якія якасці канкрэтна я звяртаю ўвагу пры наборы хлопцаў у каманду, то ў першую чаргу чалавек павінен быць байцом. Каб нават калі ты ўпаў, ты падняўся і ўсё роўна прыйшоў на пляцоўку. Акрамя гэтага, каскадзёр павінен быць акцёрам. А яшчэ — разняволены, аднак мы ўсе розныя, і для таго, каб адчуваць сябе раскавана, кожнаму патрабуецца розны час. Вядома, маюцца абмежаванні і па ўзросце: каскадзёр павінен быць не маладзейшы за 18 гадоў. Але, зноў жа, у нас ёсць хлопец, якому пятнаццаць, ён пакуль проста трэніруецца, не прымаючы ўдзел у здымках. Калі наконт «фінальнага» ўзросту ў гэтай прафесіі, то лічу, што яго няма. Літаральна нядаўна працавалі на праекце «Праведнік», там быў пастаноўшчык трукаў, яму 67 гадоў. Вядома, сам ён трукі не робіць, а толькі ставіць. Калі казаць пра ўзрост «выканаўцаў», то лічбы — зноў не галоўнае, гэта трэба адчуваць па сабе.



**«Каскадзёр — гэта не пра баявыя мастацтвы, тут хутчэй сцэнічная і тэатральная дзейнасці».**

***— А калі казаць пра гендарнае пытанне?***

— У нас у камандзе ёсць дзяўчаты, якія нічым не саступаюць моцнай палове. Яны таксама трэніруюцца, удзельнічаюць у здымках і робяць розныя трукі.

***— Як праходзяць трэніроўкі?***

— У прынцыпе як і ў любым відзе спорту: спачатку гэта размінка, потым расцяжка, затым вывучэнне асноўных прыёмаў. Гэта можа быць як баявая харэаграфія, так і акрабатыка ці барацьба ў пары. Усё залежыць ад задачы. Мы ў асноўным трэніруемся да якіх-небудзь праектаў. Напрыклад, ведаем, што хутка ў нас здымкі ў баевіку, тады робім больш упор на «прапампоўку» боек. Хочацца дасягнуць галівудскага ўзроўню. Бывае такое, што нейкія прэвізы мы самі здымаем на камеру, прыходзім да рэжысёра і прапануем новае бачанне старых трукаў.

***— Ці даводзілася выконваць небяспечныя трукі?***

— Ёсць такое меркаванне, што каскадзёр — той, хто пабег і галавой у сценку стукнуўся. Насамрэч каскадзёр павінен рабіць так, каб людзі думалі, што яму балюча, не пашкоджваючы сябе. Але, нягледзячы на гэта, рызыка ў нашай прафесіі прысутнічае заўсёды. Самымі небяспечнымі лічацца аўтатрукі. У сваёй практыцы як адзін з самых небяспечных я адзначыў бы трук з перакульваннем машыны, які здымалі для фільма кампаніі Netflix. Ну і яшчэ трук на адной з першых здымак «Прывітанне ад Кацюшы», дзе я скакаў з падкідной дошкі ў раку. У гэтай сцэне на пляцоўцы знаходзілася шмат выбуховых прыстасаванняў, пнеўмапушак з газам. Я стаяў на дошцы і павінен быў націснуць на датчык, каб скокнуць у раку. Калі гэта зрабіў, мяне выштурхнула з падкідной дошкі, я паляцеў у раку, а за мной утварыўся вогненны шар. Акрамя гэтага, небяспечнымі трукамі лічацца выкананыя на вышыні, з агнём і трукі з жывёламі.

***— Няўжо на такіх здымках абыходзіцца без траўмаў?***

— Вырашаючы стаць каскадзёрам, заўсёды разумееш, што ў гэтай прафесіі ёсць пэўныя рызыкі для здароўя і жыцця. Таму на кожных здымках, дзе запланаваны небяспечныя трукі, дзяжурыць брыгада хуткай дапамогі. Вядома, не абыходзіцца без траўмаў, часта гэта дробныя драпіны і сінякі, часам бывае горш. У мяне была значная траўма пасля здымак аднаго фільма. Мы здымалі трук з распілаваным напалову джыпам. Трэба было з яго выскачыць, зноў жа, на падкідной дошцы. Па сюжэце павінна было быць так: машына разлятаецца, ззаду мяне выбух, я вылятаю з яе. Але ў працэсе здымак узніклі праблемы з піратэхнікай, выбух адбыўся крыху раней, чым трэба. І атрымалася так, што я «ўзарваўся» раней часу, на шчасце, паспеў сцяміць і згрупавацца. А наогул, ведаеце, ніякія траўмы не напалохаюць і не прымусяць сапраўднага каскадзёра кінуць гэтую справу. Бо пакуль ёсць жаданне і гарыць агонь у вачах, страх заўсёды на другім месцы.



**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота дадзены героем.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 26.01.2022 г.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Молодечненский станкостроительный завод», ул. Замковая, 19, 222310, г. Молодечно** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**ЗДАНИЕ БЛОКА ВСПОМОГАТЕЛЬНЫХ ЦЕХОВ**
(здание специализированное для металлургического производства и металлообработки) общей площадью 2676,8 кв. м, инв. номер 630/С-79012, по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Замковая, 19М.
**Составные части и принадлежности:**
навес на металлических столбах, асфальтовое покрытие

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания блока вспомогательных цехов общей площадью 0,6144 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **228 620,16 белорусского рубля (снижение на 50 %)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 3 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов: 10.00 **11.02.2022 г.**
Окончание торгов: 11.00 **11.02.2022 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 09.02.2022 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

## СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Декабрь на Драйве! Мастеркард»

**1. Сведения об организаторе:**
Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.
**2. Наименование рекламной игры:**
«Декабрь на Драйве! Мастеркард».
**3. Срок начала и окончания рекламной игры:**
01 декабря 2021 г. – 21 февраля 2022 г.
**4. Сведения о государственной регистрации рекламной игры:**
Рекламная игра зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 24 ноября 2021 года, свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4113.
**5. Сведения о количестве участников рекламной игры:**
В рекламной игре приняло участие 63 637 участников.
**6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд разыгран полностью.
**7. Фамилия, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши):**

| Наименование Приза | Ф.И.О. Победителя |
|---|---|
| **Автомобиль: Volkswagen Taos**<br>Год выпуска: 2021<br>Цвет кузова: Белый,<br>стоимостью 62 054,00 белорусского рубля и денежные средства в сумме 9 250,02 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза | Бубен Р.В. |

**8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:** + 375 29 678 94 39.

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предмет торгов – Лот:**
легковой седан MAZDA 6, год выпуска 2009 г. в., регистрационный знак 9791 КН-7

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 9 600,00 | **Размер задатка, руб.** | 960,00 |

**Местонахождение объекта:** г. Минск, ул. Володько, д. 18, ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни, предварительно согласовав время по тел. 80296197125. **Продавец:** ООО «ПРЕМЭЛЕКТРО», г. Минск, ул. Володько, д. 18, к. 107-А, т/ф 80333025844. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 7 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи в течение 15 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дня со дня аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от начальной цены премета торгов

**Аукцион состоится 02 марта 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок оформления участия в торгах, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 01 марта 2022 г. до 17.00**

## Открытое акционерное общество «Стройдетали»

*Месторасположение:*
*Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134*

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 03 марта 2022 года ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА по адресу: г. Вилейка, ул. Стахановская, 134 (помещение столовой)**

**Повестка дня**
**1.** Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2021 год и основные направления развития в 2022 году.
**2.** Утверждение акта аудиторской проверки деятельности общества за 2021 год.
**3.** Утверждение акта ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2021 год.
**4.** Утверждение годового отчета, бухгалтерской отчетности за 2021 год.
**5.** Утверждение использования чистой прибыли за 2021 год.
**6.** Утверждение размера дивидендов за 2021 год и сроков выплаты дивидендов.
**7.** Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
**8.** Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Начало собрания в 16.00. Время регистрации 15.00 – 15.50.
Для регистрации акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность. С информацией о деятельности общества можно ознакомиться в отделе экономики начиная с 10 февраля 2022 г.
Время работы с 08.00 до 17.00. Обед с 12.00 до 13.00. Выходной: суббота, воскресенье.
Наблюдательным советом ОАО «Стройдетали» (протокол № 15 от 25.01.2022 года) принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 17.02.2022 года.

**Справки по тел.: (8-01771) 2-25-01, 2-25-10.**

УНП 600246748

## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит четвертые повторные ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ОАО «Механизированная строительная колонна № 205»

| № лота | Наименование лота |
|---|---|
| 1 | Комплекс имущества, включающий:<br>1. Капитальное строение «Инженерный корпус», инв. № 429, инв. № в ЕГРНИ 500/С-29059, общей площадью 295 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное иного назначения. Стоимость: 92 704,80 руб.<br>2. Капитальное строение «Склад-навес металлический, инв. № 425, инв. № в ЕГРНИ 500/С-28791, общей площадью 43 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического обеспечения. Стоимость: 10 450,95 руб.<br>3. Капитальное строение «Склад», инв. № 424, инв. № в ЕГРНИ 500/С-29061, общей площадью 178 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического обеспечения. Стоимость: 60 052,35 руб.<br>4. Капитальное строение «Склад № 2», инв. № 426, инв. № в ЕГРНИ № 500/С-29060, общей площадью 120 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического обеспечения. Стоимость: 43 428,30 руб.<br>5. Капитальное строение «Открытый склад № 3», инв. № 427, инв. № в ЕГРНИ 500/С-29057, общей площадью 334 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического обеспечения. Стоимость: 103 643,10 руб.<br>6. «Временный склад для хранения строительных материалов», инв. № 991, общей площадью 144 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость: 29 890,80 руб.<br>7. «Навес на УПП», инв. № 1001, общей площадью 109 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость: 19 818,90 руб.<br>8. «Навес над пилорамой», инв. № 927, общей площадью 15 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость: 2 653,35 руб.<br>9. «Навес пристройка к складу № 3», инв. № 1016, общей площадью 271 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость: 65 196,60 руб.<br>10. «Рельсовые пути», инв. № 930, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость: 270,75 руб.<br>11. «Сушильный блок», инв. № 842, общей площадью 63 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15 (незарегистрированный объект недвижимости). Стоимость: 23 013,75 руб.<br>12. «Мастерская (участок оцилиндровки)», инв. № б/н, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15 (незарегистрированный объект недвижимости). Стоимость: 25 829,55 руб.<br>13. «КТП-250 кВА», инв. № 662. Стоимость: 947,63 руб.<br>14. «Пожарная сигнализация», инв. № 851. Стоимость: 111,57 руб.<br>15. «Электролиния на УПП», инв. № 1033. Стоимость: 214,39 руб.<br>Капитальные строения и другие объекты, входящие в лот № 1, расположены на земельном участке площадью 0,622 га с кадастровым № 500000000004000186, предоставленном на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания производственных зданий, складских помещений и растворно-бетонного узла в промузле Колядичи. Ограничений в использовании и обременений земельным сервитутом земельный участок № 500000000004000186 не имеет |

**Начальная цена за лот № 1 с учетом НДС 20 % – 478 226,79 руб. Шаг торгов (5 %) – 23 911,34 руб. Задаток для участия в торгах (10 %) – 47 822,68 руб.**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена за лот с учетом НДС 20 %, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2 | Грузовой автомобиль ГАЗ 33021 | 1 041,60 | 52,08 | 104,16 |
| 3 | Грузовой автомобиль МАЗ 5336А5-320 | 6 279,12 | 313,96 | 627,91 |
| 4 | Самосвал MAZ 5551 | 4 653,94 | 232,70 | 465,39 |
| 5 | АТС N KP12X-M/RUB, инв. № 1115 | 8,39 | 0,42 | 0,84 |
| 6 | Биотуалет «Туалетная кабина Стандарт», инв. № 1116 | 119,61 | 5,98 | 11,96 |
| 7 | Биотуалет «Туалетная кабина»Стандарт», инв. № 1095 | 119,61 | 5,98 | 11,96 |
| 8 | Бытовка, инв. № 1122 | 361,23 | 18,06 | 36,12 |
| 9 | Бытовка 5.76*2,4*2,5, инв. № 1118 | 541,85 | 27,09 | 54,19 |
| 10 | Вертикально-сверлильный станок, инв. № 410 | 451,03 | 22,55 | 45,10 |
| 11 | Вертикально-фрезерный станок, инв. № 589 | 556,92 | 27,85 | 55,69 |
| 12 | Вибратор (наконечник и эл. привод), инв. № 1112 | 22,78 | 1,14 | 2,28 |
| 13 | Генератор ФGT 3501 BSB VG SE, инв. № 1049 | 551,41 | 27,57 | 55,14 |
| 14 | Здание мобильн. МК 7м, инв. № 626 | 541,73 | 27,09 | 54,17 |
| 15 | Измеритель влажности матер. ВИМС-2.12-Б, инв. № 1005 | 268,17 | 13,41 | 26,82 |
| 16 | Копировальный аппарат PANASONIK, инв. № 917 | 62,05 | 3,10 | 6,21 |
| 17 | Лазерный нивелир с маянт. компенсат, инв. № 1108 | 51,05 | 2,55 | 5,10 |
| 18 | Насос «Дренажник» 220/12 в комплекте с поплавком, инв. № 1136 | 68,93 | 3,45 | 6,89 |
| 19 | Нивелир лазерный линейный BOSC GLL 3-80, инв. № 1137 | 238,85 | 11,94 | 23,89 |
| 20 | Обдирочно-шлифовальн.станок, инв. № 266 | 136,97 | 6,85 | 13,70 |
| 21 | Принтер XEROX лазерный, инв. № 901 | 67,09 | 3,35 | 6,71 |
| 22 | Тепловентилятор «МАКАР» ТВ-9К, инв. № 1078 | 65,03 | 3,25 | 6,50 |
| 23 | Тиски слесарные, инв. № 712 | 11,60 | 0,58 | 1,16 |
| 24 | Токарно-винторезный станок, инв. № 170 | 1 046,83 | 52,34 | 104,68 |
| 25 | Факсимильный аппарат, инв. № 405 | 55,40 | 2,77 | 5,54 |
| 26 | Факсимильный аппарат PANASONIK KX-FL403RU, инв. № 1031 | 55,40 | 2,77 | 5,54 |
| 27 | ПЭВМ Prestigio, инв. № 1083 | 23,09 | 1,15 | 2,31 |
| 28 | Факсовый аппарат Panasonik KX-FT934RU, инв. № 988 | 9,23 | 0,46 | 0,92 |
| 29 | Алкометр Lion, инв. № 1046 | 249,32 | 12,47 | 24,93 |
| 30 | Копировальный аппарат XEROX WC 3220MFP, инв. № 1091 | 10,24 | 0,51 | 1,02 |
| 31 | Леса строительные, инв. № 1132, 20 секц. | 1 157,28 | 57,86 | 115,73 |
| 32 | Леса строительные, инв. № 1133, 20 секц. | 1 157,28 | 57,86 | 115,73 |
| 33 | Леса строительные, инв. № 1129, 3 секц. | 173,59 | 8,68 | 17,36 |

*Торги назначены на **09.02.2022 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж)**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **07.02.2022 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **ОАО «Механизированная строительная колонна № 205»** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | **Бенефициар – ОАО «Механизированная строительная колонна № 205»,** р/с BY75AKBB30126690600045400000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 100056336 |

**Условия торгов**

• к участию в торгах допускаются лица, заключившие с организатором торгов договор о задатке, внесшие денежный задаток, представившие организатору торгов в установленный срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов и зарегистрированные в соответствующем журнале;
• лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением копию платежного документа с отметкой банка об исполнении, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка. При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:
- юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;
- юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом Республики Беларусь): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;
- ИП: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;
- представителем гражданина Республики Беларусь, ИП: нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;
• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;
• договор купли-продажи подлежит подписанию в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов;
• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов;
• в случае если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;
• победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмет торгов (лота), по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает цену предмета торгов (лота) за вычетом суммы внесенного задатка в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи; иной срок для оплаты предмета торгов (лота) может быть определен соглашением сторон

Объявления о предыдущих торгах опубликованы в печатном номере газеты «Звязда» за 01.10.2021 г., 16.11.2021 г.,10.12.2021 г., 06.01.2022 г.

**Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8(017) 3480699 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30).**
**Ознакомиться с предметом торгов возможно по месту нахождения имущества после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627.**

# «ВІНТ» У НЕБЕ І НА ЗЯМЛІ

## У гонар лётчыкаў

Аляксандр Унуковіч прызнаецца: ідэя стварыць гурток авіямадэлістаў у нейкім сэнсе звязана і з размяшчэннем побач з райцэнтрам былога ваеннага аэрадрома. Праўда, лёс яго аказаўся трагічны.

Перад вайной тут стаялі савецкія самалёты. Іх немцы пачалі бамбіць у першую чаргу. Па некаторых звестках, на аэрадроме ішлі рамонтныя работы, таму самалёты стаялі без паліва. Сваю ролю адыграў і летні перыяд — пара водпускаў. Таму і экіпажы не былі ўкамплектаваныя. Хадзіла нямала чутак аб тым, што ўсе самалёты былі разбіты проста на зямлі, ніводны не ўзляцеў. Аказалася, што гэта не так.

— Ёсць дакументы аб тым, што адзін з першых паветраных таранаў у першыя дні вайны адбыўся тут, над пасёлкам Пагранічны. — расказаў Аляксандр. — Лётчык ляцеў з Беластока, у яго скончыліся боепрыпасы ў нашым раёне, і ён здзейсніў таран. Сам выжыў, на іншым самалёце з нашага аэрадрома паляцеў.

## Мадэлі для паветранага бою

Мадэлі самалётаў, як правіла, робяцца для ўдзелу ў спаборніцтвах. Тут свая спецыфіка, пэўныя класы, дзе ёсць адмысловыя патрабаванні. Напрыклад, мадэлі самалётаў паветранага бою Другой сусветнай вайны павінны быць падобныя на сапраўдныя баявыя. Пры гэтым ёсць абмежаванні па вазе.

Каб стварыць мадэль, удзельнікі гуртка знаёмяцца з рознымі гістарычнымі фактамі, якія датычацца паветраных баёў. «Гэта, з аднаго боку, цікава, з іншага — садзейнічае патрыятычнаму выхаванню», — упэўнены Аляксандр. Захапляльны і сам працэс работы над самалётам: ад чарцяжа праз 3D-мадэляванне да вырабу.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі раней асноўным матэрыялам было дрэва, то цяпер перавага аддаецца больш лёгкім, напрыклад, пенапласту і пластыку. Яны апрацоўваюцца на фрэзерным станку, які таксама зроблены членамі аматарскага калектыву «Вінт». Ёсць свой 3D-прынтар, які друкуе філаментам з... пластыкавых бутэлек. Дарэчы станок для вырабу філамента таксама ўдасканалены гуртоўцамі. Члены народнага аматарскага аб'яднання часцей аддаюць перавагу самалётам Вялікай Айчыннай вайны.

Звяртае на сябе ўвагу ярка-чырвоная мадэль. Аказваецца, яна з'явілася невыпадкова і сімвалізуе гераізм ваеннага лётчыка-віртуоза Аляксея Алёхіна. У 1944 годзе ён лятаў на манаплане-знішчальніку Ла-7, яго механік за ноч пафарбаваў у ярка-чырвоны колер. Пасля чаго савецкага аса нямецкія лётчыкі ахрысцілі «чырвоным баронам».

— Мы не толькі робім авіямадэлі, але і вывучаем па іх гісторыю бераставіцкага краю. Калісьці на ўзбраенні мясцовай вайсковай часці былі незвычайныя манапланы І-16. Мы стварылі яго зменшаную копію, — дадае Аляксандр Унуковіч. —

## Брэндавы фестываль — ад трох гадоў і вышэй

Захапленне авіямадэлямі стала сямейным хобі Унуковічаў. Больш за тое, сын абраў сабе прафесію, звязаную з беспілотнай авіяцыяй. На думку Аляксандра, гэта перспектыўны кірунак у эканоміцы краіны. Дачка таксама займаецца ў клубе.

Аляксандр успамінае, як першакласнікам прыйшоў у авіямадэльны гурток. Праўда, узялі не адразу, бо палічылі, што ён яшчэ малы і не асіліць гэтую справу. Тады хлопчык самастойна па кнізе зрабіў свой першы самалёт і з ім прыйшоў у гурток. А вось мара стаць лётчыкам не спраўдзілася. Аляксандр не шкадуе, бо здолеў увасобіць яе ў сваім захапленні і перадаць дзецям. Сярод членаў гуртка нямала навучэнцаў Бераставіцкага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя, дзе Унуковіч працуе старшым майстрам.

Мясцовыя жыхары ведаюць яго і як арганізатара аднаго з самых відовішчных фестываляў раёна «Бераставіца збірае сяброў». Сюды кожнае лета прыязджаюць авіямадэлісты з усёй Беларусі, ёсць і замежныя ўдзельнікі. Сёлета фестывалю споўніцца дзесяць гадоў. Брэндавае свята заўважылі і турысты. Яны разбіваюць палаточны лагер і сочаць за ходам спаборніцтваў. Аказваецца, аматараў гэтай справы ў Беларусі нямала. Прычым хобі для многіх застаецца на ўсё жыццё.

— На наш фестываль радыёкіраваных мадэляў часта прыязджаюць былыя чэмпіёны Беларусі па планерным спорце, якія займаюцца з 70-х гадоў. А самаму маламу ўдзельніку было каля трох гадоў, ён таксама запускаў самалёт, які зрабіў яго бацька. Мадэліст — гэта той, хто кіруе. Неабавязкова ўдзельнік спаборніцтваў павінен быць канструктарам — ён можа і на чужым самалёце лятаць. І гэта не так проста. Бо ёсць розныя тэхнікі: гоначная, пілатажная, фрыстайл. Ёсць мадэлі-копіі, ёсць эксперыментальныя мадэлі — такіх няма ў сапраўднай авіяцыі.

Дарэчы, гурток «Вінт» мае шырокі спектр дзеянняў. Нядаўна тут заняліся беспілотнымі праектамі. Ёсць ідэі і па распрацоўцы новых станкоў для спрашчэння тэхналогіі вырабу. Вядзецца пошук новых матэрыялаў для канструявання радыёкіраваных мадэляў — самалётаў, верталётаў, караблёў і нават робатаў.

## Не толькі самалёты

А яшчэ гуртоўцы — актыўныя ўдзельнікі рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Напрыклад, сёлета дэманстравалі спецыяльны прыбор для аўтаматычнага доступу ў памяшканне. Ён асабліва актуальны падчас пандэміі, бо дазваляе бескантактна кантраляваць тэмпературу цела чалавека, які ўваходзіць у памяшканне. Калі тэмпература ў норме, ён прапануе прадэзінфіцыраваць рукі, аб чым падаецца адпаведны гукавы сігнал. Дзверы адчыняюцца аўтаматычна, не трэба брацца за ручкі. Калі тэмпература не ў норме ці не прадэзінфіцыраваны рукі, не атрымаецца прайсці далей. Пакуль прыбор існуе ў адным экзэмпляры.

Удзельнікі народнага аб'яднання неаднаразова выходзілі пераможцамі абласнога конкурсу «Тэхнаёлка». Сёлета іх экспанаты дэманстраваліся і на заключным рэспубліканскім этапе. А яшчэ работы гуртоўцаў займалі прызавыя месцы на злётах рацыяналізатараў і вынаходнікаў. «Любы прадмет можна дапрацаваць, нешта новае знайсці, каб развівацца. Заняткі ў такіх гуртках садзейнічаюць развіццю дзяцей, яны пачынаюць па-іншаму мысліць. Прыемна, што тэхнічная творчасць адраджаецца», — заўважае суразмоўнік.

Цяпер даволі моднай стала робататэхніка. Прычым усе дэталі можна купіць гатовыя — толькі складай. «Вінт» пайшоў па іншым шляху. Тут не карыстаюцца гатовымі канструктарамі, а робаты распрацоўваюцца і робяцца з нуля: і корпус, і механіка, і алгарытм работы. Так на свет з'явіўся робатёлка, што танцуе і спявае.

— У нас ёсць распрацоўка для зваршчыкаў, у ліцэі маецца такая спецыяльнасць. Для таго каб іх лягчэй вучыць, у маску зваршчыка мантуецца відэакамера для дыстанцыйнага кантролю. Ідэя ў тым, каб вачыма майстра паказаць навучэнцам, як правільна варыць шво. Працэс бачны на экране, — распавядае кіраўнік гуртка.

На злёце рацыяналізатараў і вынаходнікаў падчас дэманстрацыі гэтай мадэлі адзін з членаў журы, прадстаўнік буйнога завода, прапанаваў аформіць патэнт на распрацоўку. Магчыма, ідэя бераставіцкіх гуртоўцаў атрымае практычны працяг і шырокае распаўсюджанне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

27 студзеня — Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту

# ВАЙНА ПРАЙШЛА ПРАЗ СЭРЦА

**Франтавік, журналіст, руплівец захавання памяці, ён аднавіў сотні імёнаў герояў, стварыў у Брэсце навукова-асветніцкі цэнтр «Халакост»**

Аркадзь Бляхер працаваў ледзь не да апошняга свайго дня. Пісаў, запісваў, сістэматызаваў, складаў каталог уласных матэрыялаў. А лёс адвеў былому франтавіку 97 гадоў. Удзельнік Сталінградскай бітвы, ён лічыў сваім абавязкам вярнуць з небыцця імёны невядомых пакуль герояў — абаронцаў, вызваліцеляў — і ўвекавечваць іх. Пачынаючы з 1950-х гадоў на матацыкле аб'ездзіў ці не ўвесь Брэсцкі раён, дзе запісваў сведчанні жыхароў; звязваўся з архівамі. На пэўным адрэзку жыцця засяродзіў намаганні на тэме Халакосту. З задавальненнем сустракаўся з моладдзю, выступаў у школьных, студэнцкіх калектывах.

Аркадзь Майсеевіч быў чалавекам жвавым, лёгкім на пад'ём, вызначаўся пачуццём гумару. Напрыклад, падтрымліваў жарты наконт уласнага прозвішча. Расказваў, што яго дзед і прадзед былі патомнымі бляхарамі (па-руску «жестянщики»), адсюль і прозвішча. А вось на прапановы ад уласнага кіраўніцтва прозвішча змяніць адказваў цвёрда: «Я сваё прозвішча напісаў на рэйхстагу і ніколі не памяняю яго». Франтавікі яго разумелі.

Аркадзь Бляхер нарадзіўся ў студзені 1923 года ў Мінску. У 1941-м скончыў 10 клас, атэстаты ім уручалі 21 чэрвеня, а назаўтра была вайна. У тым жа годзе ўчарашні школьнік стаў курсантам Сталінградскага артылерыйскага вучылішча, якое скончыў за няпоўны год з адзнакай і адразу быў накіраваны на фронт. Сваё баявое хрышчэнне юны афіцэр атрымаў пад Сталінградам. Там жа быў паранены, лячыўся ў шпіталі горада Энгельса. У пачатку 1943-га зноў атрымаў цяжкае раненне. Ваяваў на Данскім, Паўднёвым, 3-м і 4-м Украінскіх, 1-м Беларускім франтах, удзельнічаў у вызваленні Варшавы, дайшоў да Берліна. Артылерыст-разведчык вайну скончыў начальнікам штаба дывізіёна ў званні капітана. Быў узнагароджаны трыма ордэнамі, медалямі.

Пасля вайны паступіў у Мінскі юрыдычны інстытут, а потым усё ж скончыў факультэт журналістыкі завочна. Бо яшчэ з ваенных гадоў супрацоўнічаў з франтавымі газетамі, пісаў і збіраў матэрыялы. Пасля атрымання дыплома прыйшоў на работу ў брэсцкую абласную газету "Заря", пазней перайшоў адказным сакратаром у раённую газету «Заря над Бугом». Вось там ён і ўзяўся за пошукавую работу. На рэдакцыйным матацыкле аб'ездзіў усе вялікія і малыя населеныя пункты раёна, пісаў найбольш аб героях-франтавіках. Збіраў матэрыялы пра загінулых, перапісваўся з іх роднымі, накіроўваў запыты ў архівы.

За гады работы Аркадзь Бляхер сабраў матэрыялы пра дзесяць Герояў Савецкага Саюза, якія загінулі пры вызваленні Беларусі, Польшчы, Германіі, астанкі якіх пахаваныя ў Брэсце. А мемарыяльная дошка на помніку ў гарадскім парку ўвекавечыла памяць аб героях. Ён знайшоў звесткі пра дзясяткі салдат і афіцэраў пагранічных застаў, якія загінулі ў першыя дні вайны і доўгі час лічыліся, што прапалі без вестак.

Вялікую работу правеў Аркадзь Майсеевіч па пошуку сведчанняў гібелі ахвяр Халакосту, скрупулёзна ішоў па слядах подзвігу воінаў і партызанаў на тэрыторыі Беларусі, перш за ўсё на Брэстчыне. Дзякуючы яму ў шэрагу гарадоў з'явіліся помнікі і мемарыяльныя дошкі, дапоўніліся надпісы на помніках, вуліцам і прадпрыемствам надалі імёны герояў. Увекавечвалася памяць ахвяр з ліку мірнага насельніцтва. Менавіта яго клопатамі было даведзена да канца абсталяванне помніка 54-м тысячам чалавек, якіх расстралялі на Броннай Гары ў Бярозаўскім раёне. Быў створаны помнік-мемарыял ахвярам Брэсцкага гета.



**Аркадзь БЛЯХЕР на сустрэчы са школьнікамі.**

У 1995 годзе Аркадзь Бляхер стварыў Брэсцкі навукова-асветніцкі цэнтр «Халакост» і доўгі час яго ўзначальваў. Прайшоў цэлы шэраг навуковых канферэнцый, круглых сталоў, быў апублікаваны зборнік дакументаў па трагедыі яўрэяў Беларусі падчас акупацыі. Аркадзь Бляхер усяляк спрыяў стварэнню дакументальнага фільма «Брэсцкае гета», пазней гэты фільм атрымаў Гран-пры на адным з еўрапейскіх фестываляў. Цэнтр «Халакост» з пачатку ўтварэння праводзіў вялікую асветніцкую работу. Пасля бацькі эстафету падхапіла дачка Бляхера Рэгіна Сіманенка.

Ён гаварыў, што вайна не адпускае яго, узнікае ў снах, раптоўных згадках эпізодаў, таварышаў, падзей. Вучні ўважліва слухалі. Некаторыя з іх, можа, упершыню дакрануліся да тэмы вайны не з дапамогай экранных баевікоў і камп'ютарных гульняў, а дзякуючы жывому ўдзельніку, які там быў, памятае, нясе ў сваім сэрцы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**




**Место и дата составления отчета:**
26.01.2022 г.
Минский район

1. Организатор: частное предприятие по оказанию услуг «Голден Медиа Компани», 223056, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, п. Скориничи, ул. Ясная, 7. УНП 691751128.
2. Наименование рекламной игры – «Марафон удачных покупок с Белгазпромбанком».
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4078 от 27.09.2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.
4. Срок начала рекламной игры: 01 октября 2021 г.
Срок окончания рекламной игры: 31 января 2022 г
5. Количество участников рекламной игры: 7 810 участников.
6. Призовой фонд разыгран полностью.
7. Победители рекламной игры:
1. Главный ежемесячный приз за октябрь 2021 г.: 5 000,00 рублей. Победитель – Авсюкевич Юрий Анатольевич, г. Минск и 500 (пятьсот) победителей. Каждый победитель выиграл денежный приз в размере 100,00 (сто) рублей 00 копеек.
2. Главный ежемесячный приз за ноябрь 2021 г.: 5 000,00 рублей. Победитель – Мазуренко Наталья Юрьевна, г. Минск и 500 (пятьсот) победителей. Каждый победитель выиграл денежный приз в размере 100,00 (сто) рублей 00 копеек.
3. Главный ежемесячный приз за декабрь 2021 г.: 5 000,00 рублей. Победитель – Чепурная Наталья Руслановна, г. Минск и 500 (пятьсот) победителей. Каждый победитель выиграл денежный приз в размере 100,00 (сто) рублей 00 копеек.
4. СУПЕРПРИЗ: 20 000,00 рублей. Победитель – Якуненко Александр Александрович, г. Гомель.
Все призы перечислены на расчетные счета Победителей до 31 января 2022 года (включительно).

Списки победителей находятся на сайте ОАО «Белгазпромбанка», www.belgazprombank.by, в разделе «Новости».
8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (29) 183-79-34.
9. В ходе проведения рекламной игры нарушений допущено не было.

Заместитель директора: частное предприятие «Голден Медиа Компани» Н.В. Алехно.

# Біблія на беларускай мове: «Галоўнае — абапірацца не на прыдуманыя ўяўленні, а на тысячагадовы вопыт набожных папярэднікаў»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Адкуль можна весці адлік гісторыі перакладу Свяшчэннага Пісання на беларускую мову?***

— На беларускіх землях «кнігапісцаў», якія так ці інакш пры адаптацыі перакладаў кірыла-мяфодзіеўскай традыцыі выкарыстоўвалі мясцовыя варыянты кніжнай мовы, даволі шмат. Адпаведна, да ліку такіх помнікаў правамерна аднесіць, напрыклад, цяпер шырока вядомыя Евангеллі — Тураўскае (XI стагоддзе), Полацкае (XII стагоддзе) і Слуцкае (XVI стагоддзе), Псалтыры — Мсціслаўскі/Смаленскі (1395), Віцебскі (1492), Пінскі (1543). Існаваў названы пазней «беларускім» звод Бібліі, складзены Матфеем Дзясятым (1502—1507 гг. ) і дыяканам Фёдарам (1514), а ў XVI ст. на тэрыторыі ВКЛ меўся пераклад 11 кніг Старога Запавету — кім здзейснены, невядома; акрамя таго, захаваліся звесткі, што прыкладна ў той жа час перакладаў Біблію архімандрыт Супрасльскага манастыра Сергій Кімвар. Нельга забывацца таксама пра выключную значнасць выдадзенага ў Астрозе поўнага славянскага тэкста так званай Астрожскай Бібліі (1581) — з выпраўленнем раней вядомых рэдакцый.

Неабходна ўлічваць, безумоўна, тую акалічнасць, што на тэрыторыі цяперашняй Беларусі ў XVI-XVII стагоддзях дзейнічала больш за дзясятак друкарань. Асобная тэма — дзейнасць Скарыны, які са сваімі прадмовамі і пасляслоўямі выдаў Псалтыр і 22 кнігі Бібліі ў Празе (1517—1519), а затым, перабраўшыся ў Вільню, надрукаваў «Малую падарожную кніжку», што ўключала Псалтыр (1522) і «Апостал» (1525).

Пры ўсім гэтым адлік гісторыі перакладу Свяшчэннага Пісання на ўласна беларускую мову, сцверджаную ў якасці самастойнай, можна весці толькі з XX стагоддзя, калі мова займела ўнармаванне і ўсё, што з гэтым звязана, — граматыку, слоўнікі...

***— Даводзіцца чуць думку, што ў Беларусі дасюль няма адзінага перакладу Бібліі, які б задавальняў усіх... Ці сапраўды? Чаму так склалася?***

— Гэта сапраўды так. Уяўляеце, мы цяпер маем каля 20 перакладаў Новага Запавету і тры пераклады ўсёй Бібліі на сучасную беларускую мову, чаму маглі б зайздросціць нават носьбіты моў з самым высокім — міжнародным статусам! Маглі б, каб згаданыя пераклады адпавядалі сур'ёзным патрабаванням, галоўнае з якіх — прыдатнасць іх для богаслужэнняў. Аднак тое, што мелася, з розных прычын у богаслужэбны ўжытак увайсці ніяк не магло. Агульнапрынятага перакладу мы не маем і, відаць, няхутка дачакаемся.

У чым жа справа? Паспрабую назваць самыя значныя прычыны. Першая і асноўная з іх заключаецца ў тым, што беларуская мова — аб'ектыўна — застаецца ў статусе абмежаванага выкарыстання. Другая, таксама вызначальная, — рознаканфесійнасць. Паказальна, што многія беларускамоўныя пераклады Свяшчэннага Пісання прызначаліся для выкарыстання толькі ў межах сваёй канфесіі альбо нават вузейшай царкоўнаадміністрацыйнай структуры, а некаторыя ўвогуле рабіліся без канкрэтнага разліку на богаслужэбны ўжытак. Гэтым абумоўлены відавочныя хібы і пралікі. Скажам, адпаведныя «творчыя пошукі» і «вынаходніцтвы» паства ўспрымае як прафанацыю, нават кашчунства. А хіба можна рэагаваць інакш, калі ў Евангеллі сустракаеш імёны Хахіль (замест Тэафіл/Феафіл), Салома (замест Саламія), калі варыянт імені па бацьку, азначэння радаводу гучыць як мянушка: «Давід жа нарадзіў Салямона ад Урыхі», калі натыкаешся на такі выраз як «у вінішчу сваім фігу» замест «у садзе (вінаградніку) сваім смакоўніцу». Нельга пакідаць без увагі і яшчэ адну важную акалічнасць: у дадатак да таго, што беларускія перакладчыкі Свяшчэннага Пісання прадстаўляюць розныя канфесіі, шэраг перакладаў другой паловы XX стагоддзя выкананы прадстаўнікамі дыяспары, аддаленай як ад грунту нашай



кніжнай мовы — царкоўнаславянскай, так і ад жывога асяроддзя сучаснай беларускай мовы. Нельга не адзначыць, што найбольшыя складанасці задае «канфесіянальнае двухмоўе». Што я маю на ўвазе? А тое, што свет не ведае статусных моў, дзе б адначасова ўжываліся цэлыя пласты такой лексікі, якая відавочна б сведчыла пра адрозную свядомасць (прычым — веравызнальную!) іх носьбітаў: царква — касцёл, манастыр — кляштар, літургія — імша, Гасподзь/Госпад — Пан/Спадар, Іісус/Ісус — Езус, ангел — анёл, Вялікдзень — Вельканоц, Благавешчанне — Звеставанне... Адпаведна, у перакладах, пра якія мы вядзём гаворку, неймаверная колькасць варыянтаў для абазначэння адных і тых жа паняццяў. Напрыклад, шасціварыянтнай з'яўляецца сама назва Благавесця/Дабравесця: Евагельле — Евангелле — Евангеле — Эвангеле — Эвангельле — Эванэлія.

***— Я ведаю, што вы — з сям'і праваслаўных вернікаў. Калі вы самі ўпершыню сутыкнуліся з гучаннем Слова Божага на беларускай мове?***

— Асабіста я з гэтым сутыкнуўся ўжо ў сталыя гады. Варта ўлічваць, што людзі, якія своечасова былі ахрышчаны, з маленства наведвалі храмы і маліліся, не патрабавалі, каб ім перакладаліся і малітвы, і богаслужэбныя тэксты, і Пісанне. Яны працягвалі маліцца так, як памяталі з дзяцінства і як увесь час чуюць падчас богаслужэнняў; натуральна, што для іх такога кшталту патрабаванні сталі чымсьці «ад нячыстага». Між тым, з'явілася немалая колькасць тых, хто нібыта знайшоў «дарогу да храма», але не адразу мог зразумець у ім многае, уключаючы і богаслужэбную мову. Калі і адны, і другія рухаюцца да Бога, трэба дапамагаць найперш тым, каму цяжэй на гэтай дарозе. Вось адкуль патрэба ў сучасных перакладах малітваў, літургічных тэкстаў і Кнігі кніг. Тут, відаць, трэба звярнуць увагу на праблемы, звязаныя з (не)адэкватным разуменнем ролі нацыянальнай мовы ў Царкве наогул і перакладаў Свяшчэннага Пісання ў прыватнасці. Калі спыняцца на апошнім, варта згадаць прататып — славянскі Кірыла-Мяфодзіеўскі пераклад. Агульнавядома і неаспрэчна, што ён узнік перш за ўсё дзеля літургічнай і місійнай функцый (як першасных), набыўшы затым, заканамерна, усе астатнія — культурна-гістарычную, асветную, філалагічную і іншыя.

З гонарам адзначаю, што Праваслаўная Царква Беларусі гэта належным чынам улічвала, ствараючы Беларускую Біблійную камісію (ББК), дзейнасці і канкрэтнаму плёну якой свецкія СМІ, на жаль, не надавалі значэння.

***— Улічваючы недастатковую інфармаванасць шырокай грамадскасці пра гэтую Камісію, пажадана, каб вы расказалі пра яе.***

— ББК створана ў 1989 годзе па асабістай ініцыятыве светлай памяці Мітрапаліта Філарэта, які ад пачатку прыняў на сябе функцыі старшыні Камісіі, першую задачу ў адказ на запатрабаванні часу фармулюючы так: «...здзейсніць царкоўны пераклад, які павінен быць бласлаўлёны Царквою для ўжытку за богаслужэннем». Да ўдзелу ў рабоце тады запрашаліся ўсе, хто гэтую справу лічыў важнай, а статус галоўнага перакладчыка быў нададзены высокааўтарытэтнаму Васілю Сёмуху. І вось Камісія працягвае сваю дзейнасць ужо 33 гады, цяпер пад старшынствам мітрапаліта Веніяміна. Яе склад мяняўся, і цяперашні рабочы актыў натуральна спалучае святароў-багасловаў з навукоўцамі-філолагамі і прафесіянальнымі перакладчыкамі. А папярэднія змены складу абумоўліваліся найперш прычынамі суб'ектыўнымі — тым, што не ўсіх задавальняла праца саборная, заснаваная на сумоўі. Даводзіцца чуць папрокі, часам і здзеклівыя, што работа ідзе надта марудна. Але так здаецца тым, хто ацэньвае «з боку», прычым «здалёк».

Як увогуле ішла работа ББК? Няпроста, вядома ж. Так, у пераклад Евангелля ад Матфея, выкананы першым складам, мы ўнеслі больш за 1800 правак; у пераклад Евангелля ад Марка (ужо свой) — каля 800. А потым усё менш: Евангелля ад Лукі — недзе 300, Евангелля ад Іаана — пад 100... Пры гэтым ніколі не лічылі, што наша работа даведзена да ідэальнага стану. І цяпер так не лічым. Проста мы зрабілі тое, што маглі. А хто можа лепш, няхай удасканальвае далей.

> **«Пры ўсім гэтым адлік гісторыі перакладу Свяшчэннага Пісання на ўласна беларускую мову, сцверджаную ў якасці самастойнай, можна весці толькі з XX стагоддзя, калі мова займела ўнармаванне і ўсё, што з гэтым звязана, — граматыку, слоўнікі...»**

Плёнам работы з'яўляецца чатырохмоўнае (на старагрэчаскай, царкоўнаславянскай, рускай і беларускай) з паралельнымі месцамі выданне Новага Запавету, богаслужэбныя Евангеллі, Псалтыр. Членамі ББК выконваюцца адначасова і сумежныя, калі можна так сказаць, справы: падрыхтаваны і выдадзены «Звод імёнаў святых» (1995), «Кароткі царкоўнаславянска-беларускі слоўнік» (1996).

***— Ёсць меркаванне, што пераклад Пісання на нацыянальныя мовы ўтрымлівае шмат недакладнасцяў, бо шмат стагоддзяў ажыццяўляецца не з першакрыніц, і там ужо закладзеныя памылкі.***

— Каб беспадстаўныя закіды такога кшталту не прывязваліся да нашай Камісіі, удакладню, што яна выконвала пераклад Новага Запавету з грэчаскай мовы. Непасрэдна браліся арыгіналы візантыйскага тэксту ў рэдакцыі 1861/1886 гадоў (так званы агульнапрыняты тэкст — Textus Receptus, які вядомы яшчэ пад назвай «Тэкста большасці»). Ён тысячагоддзі выкарыстоўваецца Праваслаўнай царквой, з яго рабіліся і славянскія пераклады, якія пазней увайшлі ў Генадзіеўскую Біблію. Камісія звярталася таксама да грэчаскамоўных варыянтаў навуковых выданняў пазнейшага часу, якія называюць яшчэ «крытычнымі выданнямі». Важнае значэнне меў для нас пераклад царкоўнаславянскі, замацаваны царкоўналітургічнай традыцыяй ва ўжытку на працягу больш як тысячагоддзя. Абавязкова ўлічваўся таксама вопыт ператлумачэння Евангелля на розныя мовы свету, асабліва на сучасныя іншаславянскія, канкрэтна — рускую (чатыры варыянты, сярод якіх і высокааўтарытэтны сінадальны), украінскую (тры варыянты), польскую (тры варыянты), сербскую (два варыянты), балгарскую, чэшскую, славацкую. Бралася пад увагу і ўсё, што раней зроблена беларускімі перакладчыкамі — практычна ўсімі.

***— Я ведаю, што спрэчкі часцей за ўсё ўзнікаюць вакол агульнаўжывальных тэрмінаў: Раство ці Ражджаство? Гроб Гасподзень — гучыць як русізм, Труна — ужо іншы сэнс...***

— Калі ўзнікаюць такія непаразуменні, галоўнае — абапірацца не на прыдуманыя ўяўленні, а на тысячагадовы вопыт набожных папярэднікаў, у тым ліку і пакуль што не забытых найбліжэйшых продкаў. Тады ўсё расставіцца па сваіх месцах. Праўда, і тут патрэбна разважлівасць, бо далёка не ўсё пачутае ад бацькоў ці дзядоў у сваіх мясцінах адпавядае ўласна царкоўнаму календару ці іменаслову. Згадваючы, напрыклад, назвы свят ці формы імёнаў, якія бытавалі на маёй Кобрыншчыне, я ні ў якім разе не магу іх навязваць у якасці агульнабеларускіх. А каб не было ўражання, што я ўцёк ад пытання, то скажу, што, як і ўся ББК, я схільны да варыянта Ражджаство. Дарэчы, яго таксама афіцыйна падтрымаў у свой час Інстытут мовазнаўства. Для канкрэтных жа разваг прапаноўваю ўлічыць наступнае. З мэтай, каб было так, «як кажуць у народзе», раней уводзіліся словы Народзіны і Ражаство, а цяпер нашымі перакладчыкамі выкарыстоўваюцца Ражство, Раство. Ды наўрад ці іх можна лічыць больш удалымі. Па-першае, колькасць «народных» формаў назваў свята значна большая — на Брэстчыне і Беласточчыне, напрыклад, гавораць Руздво, — але яны ўжо страцілі выразнасць зыходнага значэння, празрыстасць этымалогіі. А па-другое, ад гэтых слоў немагчыма ўтварыць прыметнікі — хіба ражствянскі, раствянскі?

Зноў-такі, адзначым важны для нашых разваг факт, які чамусьці беларускімі публіцыстамі замоўчваецца, — тое, што РПЦ на тэрыторыі Расіі ў богаслужэннях цяпер, як і раней, карыстаецца мовай царкоўнаславянскай; толькі ў адзінкавых прыходах, у эксперыментальным парадку, выкарыстоўвалася сучасная руская мова; ды і гэты эксперымент вернікамі не прыняты.

***— Як вы ацэньваеце работу па перакладзе Бібліі Уладзіслава Чарняўскага?***

